Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАНЬНЯ—XV
№ 32 (3935)
АЎТОРАК, 3 ЛЮТАГА
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

АДОЗВЫ СНК СССР і БССР, ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б

АБ КАНТРАКТАЦЫІ—

баявая праграма разгорнутага сацыялістычнага наступленьня ў вёсцы

Кантрактацыя бягучага году—магутны вагар калектывізацыі, пасьпяховага правядзеньня бальшавіцкай вясны

Неадкладна разгарнуць папулярызацыю і практычнае ажыцьцяўленьне адозваў на аснове сапраўднай мабілізацыі мас калгасьнікаў, беднякоў і серадняковаў аднаасобнікаў вакол задач кантрактацыі. Руйнуючы ўдар па кулаку і яго агентуры—правых і „левых" апартуністах, якія зрываюць сацыялістычную рэканструкцыю вёскі.

Бальшавіцкімі тэмпамі—за работу!

Вялізарныя посьпехі першых двух год пяцігодкі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва як па лініі прамысловасьці, так і сельскай гаспадаркі — даюць нам магчымасьць вызначыць грандыёзныя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку на трэці рашаючы год пяцігодкі.

Гэтыя ўкладаньні дазваляюць ажыцьцявіць у гэтым годзе больш цесную арганічную сувязь з кантрактацыяй усіх патокаў матар'яльных рэсурсаў і грашовых сродкаў.

Накіроўваючы ў вёску вялізарныя сродкі і матар'яльныя рэсурсы, савецкая краіна дае сельскай гаспадарцы заказ на поўную колькасьць сельска-гаспадарчай прадукцыі на аснове папярэдняй сацыялістычнай згоды — кантрактацыі. У гэтым — асноўнае значэньне гістарычнай адозвы СНК СССР і ЦК УсеКП(б). Мы пашыраем плянавае кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, паскараем пераход да арганізаванага сацыялістычнага тавараабмену паміж горадам і вёскай.

Кантрактацыя бягучага году зьявіцца магутным вагаром САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ВЁСКІ. Яна павінна спрыяць уключэньню таварных лішкаў калгасаў і аднаасобнікаў—беднякоў і серадняковаў у дзяржаўны тавараабарот. Кантрактацыя павінна служыць адным з асноўных вагароў ДАЛЕЙШАЙ ПАСЬПЯХОВАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ МАС І ЛІКВІДАЦЫІ КУЛАЦТВА ЯК КЛЯСЫ на аснове суцэльнай калектывізацыі.

АДОЗВА СНК БССР і ЦК КП(б)Б, якая публікуецца сёньня ў нашай газэце, выразна адлюстроўвае тыя мерапрыемствы ў галіне кантрактацыі, якія павінны быць ажыцьцёўлены ў БССР на аснове гістарычнай адозвы СНК СССР і ЦК УсеКП(б).

Сельская гаспадарка БССР атрымае сёлета 17 новых МТС. Да гэтага-ж году ў нас працавала ўсяго 6 МТС. Разам з трактарамі, якія ёсьць у БССР, трактарны парк складзе 14.205 сіл. Трактарны парк БССР ужо ўвесну 1931 году павінен забясьпечыць апрацоўку і пасеў вялізарнай плошчы—280 тыс. гэкт. У будаўніцтва МТС укладаецца 6 млн. 930 тыс. руб.

На працягу бягучага году на тэрыторыі Савецкай Беларусі павінна быць пабудавана 36 новых ІЛЬНААПРАЦОЎЧЫХ ЗАВОДАЎ. Гэтае мерапрыемства адыгрывае ў нашых умовах вялізарнае значэньне. Ільнаапрацоўчыя заводы закліканы спрыяць сапраўды хуткай спэцыялізацыі значнай колькасьці раёнаў у напрамку разьвіцьця тэхнічных культур—ільну і канапель. Аб гледзьвяласьці гэтага мерапрыемства сьведчыць хаця-б той факт, што зараз у БССР налічваецца ўсяго 2 ільнаапрацоўчых заводы.

Сельская гаспадарка БССР, як сацыялістычны сэктар атрымае ў бягучым годзе непамерна больш сродкаў вытворчасьці, чым у мінулыя гады: на 26,5 млн. руб. сельска-гаспадарчых машын і прылад, 181 тыс. 600 тон розных мінэральных угнаеньняў і інш.

ПРАВІЛЬНА СКАРЬСТОЎВАЮЧЫ ГЭТЫЯ ЎКЛАДАНЬНІ Ў СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ, ЁСЬЦЬ ПОЎНАЯ МАГЧЭМАСЬЦЬ ЗАКАНТРАКТАВАЦЬ 460 ТЫС. ГЭКТ. ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР, 190 ТЫС. ГЭКТ. ІЛЬНУ, 13 ТЫС. ГЭКТ. КАНАПЕЛЬ, 120 ТЫС. ГЭКТ. БУЛЬБЫ, 8.500 ГЭКТ. ГАРОДНІНЫ, 8.500 ГЭКТАРАЎ САДАВІНЫ І РАДУ ІНШЫХ КУЛЬТУР.

Прымаючы ўсе меры да поўнага выманаўленьня плану кантрактацыі збожжавых і ўсіх іншых культур, трэба, аднак, ва ўмовах БССР асаблівую ўвагу АДДАЦЬ КАНТРАКТАЦЫІ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ. Даволі адзначыць, што з усёй плошчы пад тэхнічныя культуры ў 280 тыс. гэкт., кантрактуецца 208 тыс. гэкт., прычым у калгасах (як ільнаводных, так і неільнаводных раёнаў) падпадае кантрактацыі ўся плошча пасеваў пад лён і каноплі, а ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках ільнаводных раёнаў — 85% і неільнаводных раёнаў — 56% пасеваў пад гэтыя культуры. ТАКАЯ ШЫРОКАЯ КАНТРАКТАЦЫЯ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНАЕ ЗДАВАЛЬРЭНЬНЕ РАШАЙ ТЭКСТЫЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ СЫРЦОМ, СТВАРЭНЬНЕ БАЗЫ ДЛЯ РАЗГОРТВАНЬНЯ НОВЫХ ТЭКСТЫЛЬНЫХ ФАБРЫК, ДАЗВОЛІЦЬ УЗМАЦНІЦЬ ЭКСПАРТ.

Упяршыню мы бярэм вялікі размах у галіне кантрактацыі БУЛЬБЫ, даводзячы яе да 122 тыс. гэкт., што складае павялічэньне ў некалькі раз у параўнаньні з кантрактацыяй бульбы ў мінулым годзе. Выкананьне пляну кантрактацыі бульбы ў 1931 годзе павінна забясьпечыць нам да 600 тыс. тон таварнай прадукцыі, амаль роўнай загатоўчаму пляну 1930 году.

Фактычна ўпяршыню мы шчыльна падыходзім да кантрактацыі ГАРОДНІНЫ І САДАВІНЫ, што адыграе вялізарную ролю ў папяпшэньні і больш поўным забясьпячэньні патрэб рабочых у гэтых прадуктах.

Выразнае правядзеньне вызначанай грандыёзнай работы, правільная расстаноўка сіл і сыстэматычная праверка выкананьня дырэктыў аб кантрактацыі—асноўная зарука поўнага і пасьпяховага выкананьня намечаных плянаў. Галоўныя мэтады правядзеньня кантрактацыі выразна указаны ў адозвах СНК СССР І ЦК УсеКП(б), СНК БССР і ЦК КП(б)Б.

Пляны кантрактацыі даводзяцца да кожнага калгасу да асобнага паселішча, дзе яны павінны абавязкова шырока абмяркоўвацца на агульных сходах калгасьнікаў—у калгасах і аднаасобнікаў беднякоў і серадняковаў—у паселішчах.

У інтэрэсах большай эфэктыўнасьці як вытворчых мерапрыемстваў па кантрактацыі, так і самой кантрактацыі, трэба імкнуцца, каб пляны кантрактацыі абмяркоўваліся і прымаліся па магчымасьці адначасова з абмеркаваньнем пасеўных плянаў — у індывідуальным сэктары вытворчых плянаў — у калгасах. Гэта забясьпечыць сапраўдную цесную ўвязку кантрактацыі з пасеўнай кампаніяй.

Кантрактацыйныя дагаворы зьяўляюцца двухбаковым сацыялістычным абавязацельствам паміж пасеўшчыкам і дзяржавай, прычым калгас, як пасеўшчык, атрымлівае сродкі вытворчасьці, грашовыя авансы і прамтавары ў першую чаргу. Пасеўшчыкі абавязваюцца здаваць закантрактаваную прадукцыю ў тэрмін, што павінна забясьпечыць больш плянавы тавараварот паміж горадам і вёскай.

Асноўнае — не паўтараць памылак мінулага году. Кантрактацыя павінна праводзіцца ПРЫ САПРАЎДЫ ШЫРОКІМ УДЗЕЛЕ МАС КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ. Галоўная задача масавай работы вакол кантрактацыі — гэта дакладнае растлумачэньне асноўным масам сялянства тых ПЕРАВАГ, ЯКІЯ ДАЕ КАНТРАКТАЦЫЯ КАЛГАСЬНІКАМ. Ігнараваньне масавай работы пры правядзеньні кантрактацыі, фармальнае яе правядзеньне, якое зводзіцца толькі да таго, каб атрымаць ад пасеўшчыка подпіс пад кантрактацыйным дагаворам, ня можа інакш разглядацца, як апартунізм на практыцы, як зрыў важнейшай задачы — арганізацыі новага калгаснага прыпіву. Трэба растлумачыць, што кантрактацыя дае значныя выгады і перавагі аднаасобніку, які кантрактуе свае пасевы, перад тым аднаасобнікам, які іх не кантрактуе. Але адначасова неабходна ШЫРОКА ПАПУЛЯРЫЗАВАЦЬ ТЫЯ ВЫГАДЫ І ПЕРАВАГІ, ЯКІЯ КАНТРАКТАЦЫЯ ДАЕ КАЛГАСЬНІКАМ; ЯНЫ ЗНАЧНА БОЛЬШЫЯ ЗА ТЫЯ, ЯКІЯ АТРЫМЛІВАЕ АДНААСОБНІК.

Неабходна цьвёрда памятаць, што прыцягненьне мас да абмеркаваньня кантрактацыйнага дагавору зьяўляецца найлепшай гарантыяй праяўленьня актыўнасьці мас у поўным і своячасовым выкананьні ўзятых на сябе абавязацельстваў. Без мабілізацыі калгасьнікаў, батрацкой, беднякоў і серадняковаў вакол галоўных задач кантрактацыі, бяз шырокага скарыстоўваньня для гэтай мэты масавай работы, вялізарныя мерапрыемствы, вызначаныя партыяй і ўрадам, не дадуць належнага эфэкту.

КАНТРАКТАЦЫЯ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ПЕРШАЧАРГОВАЙ СПРАВАЙ УСІХ ПАРТЫЙНЫХ, САВЕЦКІХ, КААПЭРАЦЫЙНЫХ І ГРАМАДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЯК ЦЭНТРАЛЬНЫХ, ТАК І РАЁННЫХ. Усе раённыя арганізацыі павінны паставіць ПРАКТЫЧНУЮ работу па кантрактацыі ў цэнтр сваёй увагі.

Як практыка мінулага году, так і факты, якія ўжо нагладаюцца ў некаторых мясцох зараз, гавораць за тое, што мы і сёлета сустрэнемся з правымі і „левымі" хістаньнямі ў асобных мясцовых арганізацыях і апараце, які праводзіць кантрактацыю. Правыя элементы ў партыі выступалі супроць кантрактацыі, як аднаго з важнейшых сродкаў уплыву на сельскую гаспадарку ў бок яе сацыялістычнай рэканструкцыі. „Левакі", выступаючы ў ролі ўрэкантрактантаў, фактычна яе зрываюць. Як правыя, так і „левыя" сходзіліся на адным, што можна абыйсьціся і без кантрактацыі.

Ва ўмовах бягучага году, калі кантрактацыя пераходзіць на больш высокую ступень, калі кантрактуецца значна большая плошча пасеваў, а тэрміны здачы закантрактаванай прадукцыі абмежаваны, усялякіх апартуністычных настрояў непьга цярпець. Трэба весьці самую рашучую барацьбу з АПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДААЦЭНКАЙ КАНТРАКТАЦЫІ, трэба выгнаць з партыі і савецкага апарату нежадаючых і няздольных выконваць па-ўдарнаму баявы загад партыі і ўраду. Кулакі, якія будуць імкнуцца ўсімі сродкамі сарваць кантрактацыю, і іх агенты ў партыі — апартуністы ўсіх колераў — павінны атрымаць бязьлітасны і руйнуючы адпор.

Баявая задача ўсіх партарганізацый, савецкіх, каапэрацыйных і грамадзкіх органаў, неадкладна ўзяцца за папуляризацыю, прапрацоўку і рэалізацыю адозваў аб кантрактацыі.

Ніводнага дня маруднасьці! Практычныя мерапрыемствы ў кожнай арганізацыі і ўстанове павінны быць распрацаваны і накіраваны на месцы ЗАРАЗ-ЖА.

За практычнае ажыцьцяўленьне дырэктывы СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб кантрактацыі трэба ўзяцца па-баявому, рэалізуючы яе сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі, арганізуючы ўсю работу на аснове сацсаёрніцтва і ўдарніцтва паміж раёнамі, калгасамі і паселішчамі.

Аб кантрактацыі яравых культур пасеву 1931 г.

У выкананьне дырэктывы Савету Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) ад 21 студзеня 1931 г. аб мерапрыемствах па дапамозе савецкай дзяржавай вёсцы па калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ажыцьцяўленьні задачы ліквідацыі кулацтва, як клясы, на капітальных укладаньнях у сельскую гаспадарку і па кантрактацыі ўвесну 1931 году, ЦК КП(б)Б і СНК БССР лічаць неабходным ажыцьцяўленьне наступных мерапрыемстваў:

I. Мерапрыемствы дапамогі дзяржавай сельскай гаспадарцы

1. Накіраваць у сельскую гаспадарку БССР на працягу 1931 году 1.528 трактараў (у пераводзе на 10-ніславыя).

2. Давесьці агульны лік трактарных станцый на працягу 1931 г. да 21-х станцый з трактарным паркам у 14.205 сіл, якія-б забясьпечылі пасеў машынна-трактарнымі станцыямі ўвесну 1931 году 230.000 гэкт.

Накіраваць на капітальнае будаўніцтва МТС у 1931 годзе 6.930 тыс. руб.

3. Пабудаваць 34 новыя ільна-апрацоўчыя заводы для першачатковай апрацоўкі ільну.

4. Давесьці забясьпячэньне сельскай гаспадаркі ў 1931 годзе сельска-гаспадарчымі машынамі на суму да 26.500 тыс. руб.

Накіраваць асноўную частку гэтых машын у калгасы і МТС па ўстаноўленых напіжаных дзяржаўных цэнах.

5. Забясьпечыць сельскую гаспадарку ў 1931 годзе штучнымі ўгнаеньнямі ў колькасьці 181,6 тыс. тон агульным коштам у 3.700 тыс. руб., у тым ліку да вясны 109 тысяч.

6. Забясьпечыць сельскую гаспадарку сроднкамі барацьбы са шкоднікамі да сэзону на суму 217 тыс. руб.

7. Забясьпечыць саўгасы і калгасы гатунковым і насеннным насеньнем згодна пастаноў СНК пра весьнаную сельска-гаспадарчую кампанію 1931 году.

Гатунковае насеньне збожжавых культур адпускаць выключна ў парадку абмену на звычайнае збожжа, а насеньне тэхнічных культур і бульбы — у парадку кантрактацыі са зваротам увосень 1931 г. Вінаватыя ў выдачы гатунковага насеньня без абмену нясуць адказнасьць, як за растрату дзяржаўнай маемасьці.

Выходзячы з вышэйпамянёнага і ў мэтах кароннага паляпшэньня забясьпячэньня прамысловасьці сырцом і прадуктамі харчаваньня, аба вязаць НКГандлю і НКЗем правесьці праз сыстэму сельска-гаспадарчай каапэрацыі 1 Трактарацэнтр кантрактацыю яравых культур па наступных падставах:

II. Агульныя палажэньні па кантрактацыі

1. Агульнае кіраўніцтва і нагляд за правядзеньнем усіх відаў кантрактацыі пасеваў 1931 году ажыцьцяўляецца НКГандлю і яго мясцовымі органамі, а непасрэднае правядзеньне кантрактацыі ўскладаецца на спэцыяльныя сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі ў вызначаных для іх раёнах. У тых раёнах, дзе няма адпаведнай спэцыяльнай сыстэмы сельска - гаспадарчай каапэрацыі, цэнтр вядучай сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі заключае генеральны дагавор з іншымі цэнтрамі сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Апошнія непасрэдна кіруюць сваёй візоўкай на ўсіх відах кантрактацыі.

Кантрактацыя збожжавых культур праводзіцца спэцыяльнымі сыстэмамі сельска-гаспадарчай каапэрацыі самастойна без заключэньня генеральных дагавораў.

2. Кантрактацыя салавіны і ягад у індывідуальных гаспадарках праводзіцца сыстэмай спажывецкай каапэрацыі, якая таксама кантрактуе сады ў гарадох і салавіну, гародніну і ягады ў прыгарадных калгасах у межах вызначанага НКГандлю ліміту.

Даручыць гарадзкім саветам выдаць адпаведныя пастановы аб кантрактацыі з боку ПРК.

3. Кантрактацыя праводзіцца ў калгасах, вытворчых т-вах, паселішчах і групах пасеўшчыкаў. Правядзеньне кантрактацыі салавіны і ягадзінкаў дапускаць таксама і ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

4. Вытворчыя аб'яднаньні, паселішчы прымаюць пляны кантрактацыі ў адпаведнасьці з прынятым пасеўным плянам, прычым пастанова бядняцка-серадняцкай большасьці аб заключэньні дагавораў кантрактацыі зьяўляецца абавязковай для ўсіх членаў паселішча, якія маюць права заключаць дагаворы. Калгасы прымаюць пляны кантрактацыі ў адпаведнасьці з прынятым пасеўным плянам, зацьверджаным райкалгасасобам.

Уся праца па кантрактацыі, уключаючы афармленьне дагавораў, павінна быць скончана да 1-га красавіка.

У кулацка-заможных гаспадарках кантрактацыя не праводзіцца, а яны атрымліваюць цьвёрдыя заданьні па здачы прадукцыі шляхам вызначэньня цьвёрдага заданьня па засеве.

5. У мэтах увязкі пляну кантрактацыі з вытворчымі крэдытамі ўстанавіць, што вытворчыя крэдыты, у тым ліку крэдыты на насеньне, штучнае ўгнаеньне, сельска-гаспадарчыя машыны і прылады, адпускаюцца ў першую чаргу калгасам, а потым простым вытворчым аб'яднаньням, закантрактаваўшым свае пасевы.

6. Спэцыяльным цэнтрам сельска-гаспадарчай каапэрацыі, Белсельвясноабу, Саюзхлебу і Наркомзему забясьпечыць своячасова завоз і разьмеркаваньне насеньня, штучнага ўгнаеньня, сельска-гаспадарчых машын і прылад па асобных раёнах.

7. Выплату пасеўшчыкам за здаваную па дагаворы кантрактацыі прадукцыю рабіць па загатоўчых цэнах, якія будуць устаноўлены НКГандлю на 1931-32 год з адпаведнымі надбаўкамі за гатункоўю.

8. Па культурах, па якіх дагаворам кантрактацыі прадугледжваецца здача поўнага процанту валавога збору закантрактаванай прадукцыі, канчатковы колькасны разьмер здачы прадукцыі ўстанаўляецца на выяўленьні ўраджаю, але не пазьней, чым за месяц да пачатку ўборкі, камісіяй, склад якое вызначаецца інструкцыяй Наркамгандлю. Колькасьць прадукцыі, якая здаецца аднаасобным сэктарам, павінна быць ня ніжэй колькасьці здаванай з кожнага сэктара бліжэйшым калгасам.

9. Авансавая кантрактацыя ў першую чаргу праводзіцца ў калгасах, а потым у бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

Нормы грашовага авансаваньня для аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак устанавіць на адну трэць ніжэй норм авансаваньня калгасаў, з наліччэньнем: для калгасаў і бядняцкіх гаспадарак—7 проц. і серадняцкіх — 10 проц. галавых.

10. Даручыць НКГандлю забясьпечыць у першую чаргу дэфіцытнымі прамтаварамі калгасы і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, якія закантрактавалі свае пасевы.

III. Па збожжавых культурах:

1. Плян кантрактацыі збожжавых устанавіць:

па аўсе — 302 тыс. гэкт., у тым ліку па калгасах 48 тыс. гэкт.,
па ячмені—105 тыс. гэкт., у тым ліку па калгасах 13 тыс. гэкт.,
па крупных—40 тыс. гэкт., у тым ліку па калгасах 11 тыс. гэкт.,
па бабовых 18 тыс. гэкт., у тым ліку па калгасах 8 тыс. гэкт.

Разам 460 тыс. гэкт., у тым ліку па калгасах 80 тыс. га.

У гэтым ліку разьмер таварна-гатунковай кантрактацыі аўса вызначыць у 180 тыс. гэкт.

2. Звыш вытворчых крэдытаў устанавіць выдачу грашовых авансаў па кантрактацыі бабовых культур на плошчы 6,5 тыс. гэкт. сярэднім разьмерам грашовага авансу 9 руб. на закантрактаваны гэктар.

3. Норму здачы закантрактаванай прадукцыі на калгасах устанавіць 10 проц. па збожжавых і 50 проц. па бабовых валавога збору закантрактаванай плошчы, а на аднаасобным сэктары па збожжавых — 1/8 і па бабовых — 50 проц. валавога збору з кантрактацыйнай плошчы.

4. Устанавіць, што патрэбныя для правядзеньня таварна-гатунковай кантрактацыі аўса — 360 тыс. цэнтн. насеньня накрываюцца з наступных крыніц: цэнтралізаваных загатовак і дзяржнасенфонду — 120 тыс. цэнтн., а рэшта — 240 тыс. цэнтн. накрываюцца за рахунак насеньня самых пасеўшчыкаў у парадку ўнутрысялянскага абмену.

5. Тэрмін здачы кантрактоўшчыкамі закантрактаванай прадукцыі ўстанавіць 30 верасьня 1931 году — 30 проц. і не пазьней 30-XI 31 г. — 70 проц.

IV. Па ільне і каноплях:

1. Плян кантрактацыі ўстанавіць:

а) па ільне 190 тыс. гэкт., з якіх у раёнах, якія абслугоўваюцца МТС, — 37 тыс. гэкт.;

б) па каноплях — 18 тыс. гэкт.

2. Кантрактацыю ільну праводзіць ва ўсіх ільнаводных і асноўных таварных раёнах ільнаводзтва, а канапель — у таварных паньковых раёнах; у іншых неільнаводных і непеньковых раёнах кантрактацыя праводзіцца выключна ў калгасах.

Сьпіс раёнаў, у якіх праводзіцца кантрактацыя ільну і пяньку, устанаўляецца НКЗ і НКСнабам.

3. Кантрактацыя праводзіцца:

а) у калгасах 100 проц. пасеўнай плошчы ва ўсіх раёнах.

б) у індывід. сэктары:

У ільнаводн. раёнах — 85 проц. пасеўнай плошчы.

У неільнаводных р. — 56 проц. пасеўнай плошчы.

4. Звыш вытворчых крэдытаў устанавіць выдачу грашовых авансаў па ільне — на 105 тыс. гэкт. з сярэднім разьмерам авансу 30 руб. на гэкт., а па каноплях — 18 тыс. гэкт. па 55 руб. на гэкт.

Аванс выдаецца: 40 проц. перад пасевам і 60 проц. перад уборкай. Канчатковы тэрмін устанаўляецца НКГандлю.

5. У мэтах стымуляваньня спэцыялізацыі раёнаў у ільнаводным напрамку авансавую кантрактацыю праводзіць выключна ў ільна-водных прыазёрных, фабрычных, экспортных і прымежных да іх ільнаводных раёнах, прычым на ўсіх гэтых раёнах авансуецца поўнасьцю ўся плошча калгасу і пашыраемая плошча ў аднаасобным сэктары з сум, што засталіся пасьля здавальненьня калгасаў.

6. Насеньне для пасеву ільну і канапель адпускаецца па загатоўчых цэнах з надбаўкай у 15 проц.

7. Парадак разьліку за адпускаемае насеньне калгасам і аднаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам устанаўляецца НКСнабам і НКЗемам.

Пагашэньне пазыкі робіцца не пазьней 1-XII 31 г.

8. У ільнаводных і канапляводных раёнах выдаць пасеўшчыкам ільну і канапель 1,25 цэнтн. хлеба супроць 1 цэнтн. здаваемага валакна з тым, каб да веснавой сяўбы ў лік гэтай нормы было выдана па 0,5 проц. цэнтнэра на гэкт.

9. Захаваць на 1931 год забясьпячэньне здатчыкаў насеньня ільну і канапель алеем і макухай па нормах 1930 году (7 кілёграм алею і 10 кілёграм макухі супроць 1 цэнтнэра ільнасемя для калгасаў; 5,7 кілёграм алею і 8 кілёграм макухі для аднаасобнікаў).

10. Вызваліць ад звычайных норм здачы збожжа ўраджаю 1931 году калгасы і аднаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ільна-канапляводных раёнаў пры ўмове засеву гэтымі гаспадаркамі ня менш 10-15 проц. ільну, або ня менш 5-7 проц. канапель ад агульнай пасеўнай плошчы і пры абавязковым выкананьні імі здачы ільну па кантрактацыйных дагаворах.

11. Нормы здачы закантрактаванай прадукцыі ўстанавіць у калгасах і аднаасобных гаспадарках у процантах да ўсяго валавога збору закантрактаванай плошчы: па ільнавалакне — 80 проц., па ільнасемі — 55 проц., па пяньцы і канапляным семі — 50 проц.

12. Устанавіць наступныя тэрміны здачы закантрактаванай прадукцыі:

	IV кв. 31 г.	I кв. 32 г.	2 кв. 32 г.
Ільнасемя	— —	100 проц. —	—
Салома і трэста	— —	100 проц. —	—
Ільнавалакно	— —	70 проц. 30 проц.	—
Пянька	— —	80 проц. 30 проц.	40 проц.
Канапл. семя	— —	100 проц. —	—

V. Па бульбе:

1. Плян кантрактацыі ўстанавіць у 122 тыс. гэкт., з якіх 62 тыс. гэкт. тэхнічнай бульбы, 57 тыс. гэкт. — сталовай і 3 тыс. гэкт. раньняй сталовай бульбы, у тым ліку на калгасах 40 тыс. гэкт. і аднаасобным сэктары —82 тыс. гэкт.

2. Звыш вытворчых крэдытаў устанавіць выдачу грашовых авансаў на плошчы 25 тыс. гэкт. тэхнічнай бульбы з сярэднім разьмерам авансу ў 32 руб. на гэкт.

3. У мэтах стымуляваньня пасеваў тэхнічнай бульбы ў раёнах броварных і крухмальных заводаў авансавую кантрактацыю праводзіць выключна ў гэтых раёнах і выключна ў калгасах.

4. Норму здачы бульбы з 1 закантрактаванага гэкт. устанавіць у 5 тон.

5. Тэрмін здачы закантрактаванай прадукцыі ўстанавіць:

Бульбы раньняй — 50 проц. да 25/VII; 50 проц. — 15/VIII. Бульбы сталовай — 30 проц. да 1/X; 45 проц. — 1/XI—31 г.; 25 проц. — 15/IV 32 г. Бульбы тэхнічнай — 30 проц. 1/X; 45 проц. — 1/XI; 25 проц. — 15/XII.

VI. Па садавіне і гародніне

1. Плян кантрактацыі ўстанавіць:

Па гародніне ў 8.500 гэкт., з якіх у калгасах — 8.000 гэкт.

У тым ліку:

а) капусты позьняй	2.600	гэкт.
б) » раньняй	330	»
в) цыбулі	830	»
г) гуркоў	1.860	»
д) моркву	800	»
е) бручкі	560	»
ж) буракоў сталовых	1.020	»

Па парніковых рамах (выключна ў калгасах) — 45.000 штук. Па садавіне: а) садоў — 8.500, з іх у калгасах 7.000 гэкт., б) ягадніц—400, з іх у калгасах 100 гэкт.

Па цыкорыі (выключна ў калгасах) — 300 гэкт.

2. Звыш вытворчых крэдытаў устанавіць выдачу грашовых авансаў па цыкорыі ў колькасьці 125 руб. на гэкт.

3. Тэрміны і нормы здачы закантрактаванай прадукцыі садавіны і гародніны ўстанаўляюцца інструкцыяй Наркамгандлю.

4. У мэтах забясьпячэньня буйных гарадоў БССР гародніной, даручыць НКГандлю прымацаваць да буйных ЦРК раёны кантрактацыі гародніны на аснове ўмоў непасрэдна з райкаапсаюзам, згодна генэральнага дагавору паміж Белсадсаюзам і Белкаапсаюзам.

Даручыць НКГандлю, спэцыяльным сыстэмам сельска - гаспадарчай каапэрацыі і НКЗему скласьці інструкцыю аб парадку правядзеньня кантрактацыі, а таксама і тыповыя дагаворы.

НКГандлю распрацаваць адзіны тыповы дагавор на кантрактацыі ільну і канапель, а другі — на кантрактацыі ўсіх іншых культур.

Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б закліканы усе партыйныя, савецка-гаспадарчыя, каапэрацыйна - калгасныя і камсамольскія арганізацыі ўзяцца па-бальшавіцку за справу кантрактацыі яравых пасеваў, мабілізаваць свае сілы і растлумачыць масам рабочых, калгасьнікам і бядняцка-серадняцкім масам вёскі значэньне правядзімых савецкай уладай мерапрыемстваў па тэхнічным пераўтварэньні і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, стаць на чале новага ўдару калгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць гэтым самым рашучыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва, як клясы, і сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Даручыць усім партыйным, савецкім і гаспадарчым арганізацыям наладзіць шырокую прапагандоўку адозвы (пастановы) ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ад 21/1 1931 г. па кантрактацыі.

Старшыня СНК БССР
ГАЛАДЗЕД.

Сакратар ЦК КП(б)Б
ГЕЙ.

Магутныя дэманстрацыі беспрацоўных у Англіі

ЛЕНДАН, 1. Сёньня ў галоўнейшых прамысловых цэнтрах Англіі адбыліся дэманстрацыі беспрацоўных і працуючых рабочых, якія былі арганізаваны Усеагульным камітэтам беспрацоўных у мэтах падрыхтоўкі да міжнароднага дня барацьбы супроць беспрацоўя—25-га лютага. На дэманстрацыях прымаліся рэзалюцыі, у якіх заяўляецца, што прапановам каралеўскай камісіі па пытаньні аб беспрацоўі, якія яшчэ больш пагоршаюць становішча беспрацоўных, будзе даны рашучы адпор. Рэзалюцыі падкрэсьліваюць, што каралеўская камісія зьяўляецца адной з прылад, шляхам якое капіталісты праводзяць пры дапамозе лейбарысцкага ўраду ногае наступленьне на жыцьцёвы ўзровень усяго пралетарыяту.

Дэманстранты пратэставалі таксама супроць турэмнага зьяўленьня Мак Ільгона (адзін з выдаўцоў органу кампартыі «Дэйлі Уоркер», асуджаны на 6 месяцаў турмы на абвінавачаньні ў «зьняваге суда») і заклікалі да ўсямернага палтрыманьня «Дэйлі Уоркер».

У Лёндане, ня гледзячы на праліўны дождж, калёны дэманстрантаў накіроўваліся з розных раёнаў на Трафальгарскі пляц, дзе адбылася центральная дэманстрацыя. Дэманстрацыя адначалася бяльным настроем яе ўдзельнікаў і іх цьвёрдай рашучасьцю — арганізавана правяści міжнародны дзень барацьбы супроць беспрацоўя. Выступаўшыя з прамовай т. т. Раст, Ман і Госін выкрылі сутнасьць «рабочага» ўраду і заклікалі рабочых абярнуць дзень 25-га лютага ў дзень самай магутнай дэманстрацыі пралетарскіх сіл.

Барацьба вэнгерскіх рабочых супроць наступленьня капіталу

ВЕНА, 26. Паводле паведамленьняў з Будапэшту прадпрыемцы тэкстыльнай прамысловасьці патрабуюць 20-30 процантнага скарачэньня і бяз гэтага жабрацкай зарплаты тэкстыльшчыкаў. У прыгарадзе Будапэшту на трох тэкстыльных фабрыках выбухнула ўсеагульная забастоўка пратэсту супроць скарачэньня зарплаты і капіталістычнай рацыяналізацыі. На некаторых будапэшцкіх тэкстыльных фабрыках забастоўка працягваецца ўжо 8 дзён. Рафармісцкія прафбюракраты, як звычайна, вядуць згодніцкую палітыку. Аднак, рабочыя, пад кіраўніцтвам прафапазыцыі, адхіляюць усе кампрамісныя прапановы і арганізуюць на прадпрыемствах камітэты барацьбы.

Пяцігодка бязумоўна будзе ажыцьцёўлена

Панічны страх сусьветнай буржуазіі

ВЕНА, 26. З Будапэшту паведамляюць, што там адбылася лекцыя інжынэра Кіршнэра аб пяцігадовым плане сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР. Лектар, які па запрашэньні ВСНГ працаваў 7 месяцаў у СССР у якасьці тэхнічнага экспэрта, заявіў, што ў Савецкім Саюзе адбываецца грандыёзнае сацыялістычнае будаўніцтва і што пяцігадовы плян бязумоўна будзе праведзен у жыцьцё. У СССР разьвіваецца магутная прамысловасьць і з аграрнай дзяржавы савецкая Расія ператварацца ў магутную прамысловую краіну.

***

ПАРЫЖ, 27. Паводле паведамленьняў «Матэн» у Парыжы адбыўся дыспут на тэму «Дух бальшавізму» пры ўдзеле Обэра, заснавальніка Лігі для барацьбы з інтэрнацыяй алам. Сваёй прамове Обэр патэтычна пытаўся: «Ці магчыма, што ў той час, як СССР хоча разбурыць стары сьвет сваёй палітыкай індустрыялізацыі, буржуазія сьпяшаецца забясьпечыць СССР сырцом, машынамі і тэхнічнымі сіламі». Обэр заявіў, што нават калі посьпехі пяцігодкі будуць частковымі, яна можа выклікаць сусьветную катастрофу.

АБ ЭКАНОМНЫМ ВЫДАТКАВАНЬНІ ГАРУЧАГА

Пастанова СНК СССР

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляе:

1. Строга забараняецца выдаткоўваць не па простым прызначэньні гаручае, якое адпускаецца для трактараў і с.-г. машын.

Кіраўніні рэспубліканскіх і краявых (абласных) органаў, якія разьмяркоўваюць гаручае, дырэктары саўгасаў і машына-трактарных станцый, старшыні калгасаў і ўсе асобы, на якіх непасрэдна ўскладзена хаваньне і скарыстаньне гаручага для трактараў і сельска-гаспадарчых машын, адказваюць за выдаткаваньне яго на другія патрэбы, як за растрату дзяржаўнай маемасьці.

2. Урады саюзных і аўтаномных рэспублік, краявыя (абласныя) і раённыя выканаўчыя камітэты абавязаны ўстанавіць суровы нагляд за скарыстаньнем гаручага, якое прызначана для трактараў і сельска-гаспадарчых машын, і няўхільна прыцягваць да адказнасьці ўсіх асоб, якія выдаткоўваюць гаручае не па простым прызначэньні.

Да X-га Усебеларускага Зьезду Саветаў

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР пастанавіў склікаць X Усебеларускі Зьезд Саветаў

20-га лютага 1931 году ў гор. Менску

Парадак дня:

1. Справаздача Ураду БССР.
2. Даклад Наркамзему аб саўгасным і калгасным будаўніцтве.
3. Даклад Вышэйшага Савету Народн

Узброіць масы марксыцка-ленінскай тэорыяй

Рад партарганізацый праваліле вучобу ў першай палове зімовага пэрыяду

Слабое наведваньне школ, частыя зрывы заняткаў—рэзультат апартуністычнай недаацэнкі значэньня тэарытычнай вучобы, няўменьня ўвязаць вучобу з практычнай работай.

Ігнаруюць дырэктывы партыі

У пэрыяд разгорнутага па ўсім фронце сацыялістычнага наступленьня, якое праходзіць ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня, асабліва ўзрастае роля партыйнай вучобы і прапаганды, якая ўзбройвае масы на барацьбу за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, узрастае роля рэвалюцыйнай тэорыі, зброі бальшавізму ў барацьбе з апартуністамі розных колераў і у першую чаргу з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, і прымірэнчымі адносінамі да яго. Не разумець і недаацэньваць ролі рэвалюцыйнай тэорыі ў сучасны момант могуць толькі апартуністы і асобы, якія загразлі ў балоце бяспрынцыпнага дзяляцтва.

Ня гледзячы на тое, што ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 13-IX—30 г. рашуча асудзіў абыякасныя адносіны да партвучобы і прапанаваў усім партарганізацыям «прыняць усе неабходныя меры да пашырэньня і паляпшэньня якасьці партыйнай вучобы», усё-ж недаацэнка палітычнага значэньня гэтага пытаньня ў некаторых парткомах, парткалектывах і ячэйках пагледзецца і да гэтага часу.

Гэта пастанова ва ўсю шырыню ставіць пытаньне аб адказнасьці парткомаў, парткалектываў, цэх'ячэек і наогул усяго арганізацыі за павышэньне марксыцка - ленінскай падрыхтоўкі членаў, кандыдатаў партыі, а таксама беспартыйнага актыву. Асабліва значэньне гэта набывае зараз, калі ад камуністаў патрабуецца асабістая клясавая пільнасьць як на ідэалёгічным фронце, так і на фронце практычнай работы.

Калі мы будзем праводзіць нашу тэарытычную партвучобу самацёкам, без сыстематычнага кіраўніцтва, калі гэтай справай будуць займацца толькі культпропы, а ня ўся партарганізацыя, дык справа з месца ня зрушыцца. Недаацэнка партвучобы, самацёк у яе правядзеньні існуе ў калектывах 9 вуч. цягі, зав. імя Ланцуцкага, «Вэзувія», «Пралетара», «Рухавік рэвалюцыі», Сельмашу і іншых.

Камплектаваньне школ партасьветы праходзіла без арганізацыі грамадзкасьці вакол задач партыйнай вучобы. Запіс слухачоў праводзіўся завочна. У выніку — заняткі ў школах пачаліся з вялікім спазьненьнем. На заводзе імя Ланцуцкага з запісаных у партсетку 240 чал. на заняткі зьяўляецца 53, альбо 22 проц.; 9 вуч. цягі — з 112 зьяўляецца 27, альбо 24 проц., таксама і па астатніх калектывах і ячэйках.

Сыгналы друку і рад мерапрыемстваў з боку Культпропу гаркому (нарада культпропаў, сэкратару па вучобе, стварэньне грамадзкай думкі вакол гэтага пытаньня) зрабілі некаторы зрух у бок паляпшэньня наведваньня школ і гурткоў партасьветы.

Па некаторых прадпрыемствах мы маем пры актыўным удзеле школы рост ударніцтва, збор пэму, паляпшэньне якасьці прадукцыі, 100-процантнага выкананьне прамфінпляну і г. д. Гэтага няма па 9 вуч. цягі, зав. імя Ланцуцкага, Сельмашы, ф-цы «Вэзуві» і зав. «Рухавік рэвалюцыі», дзякуючы таму, што вучоба пастаўлена кепска, няўвязана з задачамі выкананьня прамфінпляну. Замест змаганьня за пасьпяховае выкананьне задач тэцягя рашаючага году пэрыяду ніводзі на гэтых прадпрыемствах сярод некаторай часткі партыйцаў пануюць права-апартуністычныя настрої.

Кандыдаты партыі ў партработу ня ўцягваюцца, партыйнае выхаваньне адсутнічае, за выключэньнем адзінак, кандыдаты партыі палітшколы не наведваюць. Замест разгортваньня выхаваўчай работы сярод кандыдатаў, сэкратар парткалектыву 9 вуч. цягі прапануе цэх'ячэйкам выключыць з партыі ўсіх, хто не наведвае школ партасьветы. На выкананьне дырэктыва партыі аб адборе ад 35 да 60 проц. беспартыйнага актыву партыйнымі школамі. З гэтай прычыны рост арганізацыі праходзіць слаба.

Парткалектывам і ячэйкам трэба рашуча ўдарыць па непаважнай партасьветы, узяцца за рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, пакончыць з безадказнымі адносінамі да ўзбраеньня партыйнай марксыцка - ленінскай тэорыяй.

Трэба зараз-жа пад'агуліць папярэднія вынікі вучобы, упісіць недахопы, уключыцца ў конкурс на першую пастаноўку вучобы на прадпрыемстве, правесьці дадатковае камплектаваньне, не дапускаючы памылак першага камплектаваньня.

Гэты прарыў на фронце партасьветы павінен быць ліквідаваны і ліквідэнцка пры ўмове, што ўсе парткалектывы возьмуцца за гэту справу.

Лукашык.

Вучоба ня ўвязваецца з практыкай

ЧАЧЭРСК. У раёне існуе 4 пачатковых школы партасьветы, 10 гурткоў бяручай палітыкі і 1 ВШП. Усімі відамі вучобы ахоплена 378 чалавек. З беспартыйных таварышоў—пераважная кольласьць актывістаў-калгаснікаў. Наведваньне школ у рэдкіх выпадках даходзіць да 50 проц.

Зараз у школах прапрапоўваюцца пытаньні бягучай палітыкі (пастановы пленуму ЦК УсеКП(б), нацпытаньне і інш.). Адмоўным зьяўляецца тое, што ў большасьці школ вучоба кепска ўвязваецца з практычнай работай. Прапагандысцкі склад мала працуе над павышэньнем свайго палітычнага ўзроўню.

Завочнымі відамі вучобы ахоплена 13 малавек партыйнага актыву. Арганізаваны гурток для вывучэньня пытаньняў ленінізму не працуе. Неналежнае заняткаў гэтага гуртка партыйцы апраўдваюць перагрузкай на партыйнай і грамадзкай рабоце. У некаторых работнікаў РК існуе такі погляд, што вучыцца можна толькі пры ўмовах вызваленьня ад усіх відаў нагрузкі.

Г. Г.

ЖЛОВІН. Большасьць школ партыйнай асьветы ў раёне працуе слаба. Асабліва кепска стаіць справа з наведваньнем заняткаў школ і палітгурткоў у ячэйках лесазаводу, райканторы, «Чырвоны Берег», Радушынскай і Страшанскай. У гэтых ячэйках нават няма вучоўку ўцягненьня ў вучобу і наведваньня школ. Некаторыя школы не забясьпечаны падрыхтаваным складам кіраўнікоў. Кіраўніцтва партасьветай у раёне ўскладзена на аднаго прапагандыста.

МАШНІЦКІ.

Праз завочнае навучаньне ўзброім масы марксыцка-ленінскай тэорыяй

(Да вынікаў партнарады па пытаньнях завочнага навучаньня)

Не прайшло яшчэ двух год, як пачала разгортвацца работа па арганізацыі партыйнай завочнай асьветы і ўцягненьні ў сыстэму гэтай асьветы шырокіх мас партыйнага актыву. За гэты, параўнальна кароткі тэрмін, па ўсім Саюзе былі арганізаваны саўпартшколы, камвузы і розныя роды завочных курсы пры дамах партыйнай асьветы.

Першыя гады існаваньня гэтай сыстэмы навучаньня ў сетцы партасьветы паказалі, што завочная сыстэма адкрывае вялізарныя магчымасьці. Яна дазваляе разьвязаць праблему пагалоўнага ўцягненьня ўсіх камуністаў, камсамольцаў і прафсаюзна-савецкага актыву ў вышэйшыя зьвяньні партасьветы.

Але трэба адзначыць, што да гэтага часу патэнцыяльныя магчымасьці гэтай сыстэмы цалкам не скарыстоўваліся. Буйнейшы пералом уносіць у справу завочнага навучаньня пастановы Усесаюзнай нарады, якая пяцёдна адбылася, па пытаньнях мясавай і завочнай партыйнай асьветы. Партыйныя і грамадзкія арганізацыі пытаньням завочнага навучаньня пачалі аддаваць больш увагі толькі тады, калі разьвязаньне праблемы падрыхтоўкі кадраў уперлася ў абмежаваныя магчымасьці сыстэмы стацыянарнага навучаньня. Пэрыяд разгорнутага будаўніцтва сацыялізму не дазваляе выключаць з вытворчага працэсу масы работнікаў, якія павінны быць у тэрміновым парадку перападрыхтаваны і кваліфікацыя якіх павінна быць узьнята на вышэйшую ступень.

Праблема падрыхтоўкі кадраў для свайго разьвязаньня патрабуе такіх высокіх тэмпаў, якія магчыма забясьпечыць толькі пры скарыстаньні ўсіх новых метадаў у культурна-прапагандысцкай рабоце. Падрыхтоўка кіруючых палітычных кадраў павінна быць узьнята на вышэйшую ступень.

Усё гэта ня толькі высоўвае на першы плян завочныя формы партасьветы, але прымушае нас перагледзець сыстэму завочнага навучаньня ў напрамку яе паляпшэньня.

Поўную рэвалюцыю ў справе камуністычнай прапаганды ўносіць навукова-асьветнае радыёвяшчаньне, якое ўключаецца ў сыстэму завочнага навучаньня.

Партыйная нарада намячае наступныя зьвяньні ў пэдагагічным працэсе пры завочным навучаньні: Па радыё перадаюцца ўступныя ўстаноўчыя лекцыі. Перад лекцыямі наперад рассылаюцца завочнікам пісьмовыя канспэкты. Пасьля радыё-лекцыі калектыўна абгаварваецца праслуханы матар'ял. Далей праходзіць самастойная індывідуальная прапрацоўка матар'ялу, пісьмовых заданьняў, складаньне пісьмовых работ, якія пасьля прапрацоўкі дасылаюцца на рэцэнзію ў ЗКС.

З пачатку разгортваньня вучэбных заняткаў праводзяцца дзесяцідзённыя ўстаноўчыя курсы-канфэрэнцыі, а пасьля прапрацоўкі праграмы таго ці іншага курсу, завочнікі выклікаюцца на курсы-канфэрэнцыі, на якіх выяўляецца ступень аўладаньня прапрацаваным матар'ялам і падводзяцца вынікі самастойнай работы завочнікаў.

Што-ж новага ўносіць у сыстэму завочнага навучаньня радыё? Яно дысцыпліне завочнікаў. Скарыстаньне радыё, як асноўнага мэтаду ў сыстэме завочнага навучаньня, набліжае ўсю сыстэму да стацыянарных форм вучобы. Радыё дае таксама магчымасьць скарыстоўваць для кіраўніцтва заняткамі найбольш кваліфікаваныя сілы. Разам з гэтым, дзякуючы радыё-вяшчаньню, партактыў набывае магчымасьць слухаць правадыроў нашай партыі, як па пытаньні бягучай палітыкі, так і па асноўных пытаньнях марксыцка-ленінскай тэорыі.

У зьвязку з гэтым нарада вызначыла вялізарную праграму па радыёфікацыі СССР.

Есьць думка, каб на працягу лютага арганізаваць ва ўсіх раённых цэнтрах пры ўсіх буйных калгасах, саўгасах і прадпрыемствах радыёаўдыторыі з колькасьцю месц у кожнай ня менш як 50. У гэтым напрамку ў РСФСР праведзена ўжо вялікая работа; арганізавана 3 000 радыё-аўдыторый.

Каб не адстаць ад узроўню радыёфікацыі СССР, неабходна па Беларусі арганізаваць ня менш як 250 радыёаўдыторый з колькасьцю ў 10-12 тысяч навушнікаў. Пры кожнай радыё-аўдыторыі павінен быць радыётэхнік і арганізатар - прапагандыст. З 1-га лютага арганізуецца перадача інстытуту масавага завочнага навучаньня; з 15-га лютага пачынаюць працаваць радыё-курсы партактыву, а з 1 сакавіка пачынае функцыянаваць камсамольскі унівэрсытэт.

З паказанага часу арганізоўваецца перадача па радыё ўводных заняткаў па праграмах завочнага Камвузу.

Нам трэба ў самыя мінімальныя тэрміны прарабіць вялікую работу. Кантынгенты партыйцаў і камсамольцаў, падлягаючых ахопу завочным навучаньнем, павінны быць на працягу лютага павялічаны ў дзесяткі раз. Вызначан дадатковы прыём у завочны Камвуз у ліку 2.000 чалавек, а ў камсамольскі унівэрсытэт — 1.000 чалавек. Этакі-ж лік трэба будзе ахапіць і завочнай саўпартшколай пры Камвузе. Уся вярбоўка і арганізацыйная работа павінна быць скончана да 1-га сакавіка. Да 1-га сакавіка пры ўсіх РК КП(б)Б павінны быць арганізаваны партбінэты з адведнай абсталяванымі радыёаўдыторыямі, якія павінны мець ня менш як 7.000 завочнікаў.

АЛ. МАКОЎСКІ.

Правальваем

У Брагінскай партарганізацыі на прапрапоўку важнейшых пастаноў пленумаў ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б)Б не мабілізавана ўвага партыйных мас.

Рад ячэек яўна недаацэньваюць значэньня партыйнай вучобы. У часе правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній заняткі ў партыйных школах былі сарваны ў сувязі з тым, што раённыя кіруючыя работнікі лічылі немагчымым адначасова праводзіць кампаніі і ўзбройваць масы марксыцка-ленінскай тэорыяй.

На працягу некалькі месяцаў не праведзена ніадной нарады з прапагандыстамі і выкладчыкамі партыйных школ. У Брагінскай ВШШ з агульнага ліку 40 слухачоў займаецца ўсяго 4 камуністы і камсамольцы.

Работа партыйных школ ня ўвязваецца з чарговымі задачамі партарганізацыі па важнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, слухачы не выхоўваюцца на канкрэтным матар'яле клясавага змаганьня, не мабілізуюцца іх увага вакол пытаньняў ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Прыкладна 30 проц. членаў і кандыдатаў партыі вучобай займаюцца самастойна. Райком не займаўся пытаньнямі праверкі як камуністы, якія займаюцца партвучобай самастойна выкарыстоўваюць вольны час для адукацыі, як яны спрацоўваюцца з тымі заданьнямі, якія ім былі даны ў пачатку навучальнага году.

Прыкладна месяц назад брыгадай культпропу было праведзена абследваньне становішча партвучобы ў раёне. Ні райком, ні ячэйкі не праверылі як выконваюцца намечаныя брыгадамі мерапрыемствы.

Прапагандыст.

Раённыя партарганізацыі не забясьпечылі баявых тэмпаў у партвучобе

БЯЛЫНІЧЫ. Партыйныя школы прыступілі да распрацоўкі пастаноў сьнежаньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б.

Вынікі за першую палову навучальнага году, якія нядаўна падведзены, гавораць аб узросшай актыўнасьці і зацікаўленасьці масы камуністаў і беспартыйнага актыву павышэньнем свайго ўзроўню і аўладаньнем марксыцка-ленінскай тэорыяй. Асноўным недахопам у арганізацыі партвучобы зьяўляецца адсутнасьць кваліфікаваных кадраў выкладчыкаў і прапагандыстаў.

М.

ДРЫБІН. Вынікі партвучобы за першую палову году з усёй выразнасьцю гавораць аб тым, што ні райком, ні партыйныя ячэйкі не аддалі належнай увагі пытаньням партыйнай адукацыі. Арганізаваныя партшколы ў сваёй большасьці не працавалі, ня былі забясьпечаны адпаведнай літаратурай. Некаторыя ячэйкі і асобныя работнікі райкому садзейнічалі правалу партвучобы па раёне тым, што ў часе правядзеньня кампаніі зрывалі заняткі ў школах.

Б.

ДРЫСА. У раёне больш як 90 проц. членаў і кандыдатаў партыі ахоплены партыйнымі школамі. Значная колькасьць беспартыйнага актыву калгаснікаў і беднаты ўцягнута ў сыстэму партыйнай асьветы.

Школы пасьпяхова скончылі прапрацоўку матар'ялаў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б, прапрацавалі матар'ялы аб рэвалюцыі 1905 году і зараз разгарнулі работу па дарэдзеньні да кожнага слухача пастаноў апошніх пленумаў ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б).

У. Н.

СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ

ДРЭННА ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ СТУДЭНЦТВА ТЭХНІКУМАЎ

ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЫ

Пастанова 16 зьезду УсеКП(б) і пастановы СНК і ЦВК БССР аб ліквідацыі пісьменнасьці і ўсеагульным абавязковым навучаньні ўпіраюцца ў востры недахват кваліфікаваных кадраў, асабліва «кадраў для кадраў».

Пасьпяховае выкананьне гэтых важнейшых дырэктыў партыі немажліва бяз узьняцьця на належную вышыню нашых навучальных устаноў, якія рыхтуюць сярэднюю праслойку чырвоных спэцыялістаў. Мы маем на ўвазе тэхнікумы, галоўным чынам пэдагагічныя.

Матар'ялы, што друкуюцца сёньня ў «Зьвязьдзе», сьведчаць аб апартуністычнай недаацэнцы ў радзе месц забесьпячэньня выкладчыцкага пэрсаналу і студэнтаў з боку сыстэмы спажывецкай каапэрацыі.

У Мазыры, Мсьціславе, Лужасьне быццам ня ведаюць пастановы СНК пра забесьпячэньне настаўнікаў і студэнтаў па рабочых нормах.

Трэба сказаць, што і райкомы КП(б)Б далёка не заўсёды прыходзяць на дапамогу тэхнікумам, не заўсёды і бяруць іх пад сваё сталае кіраўніцтва.

У выніку сярод студэнцтва нараджаюцца настроі лятунства, дэзэртырства з тэхнікумаў.

Асабліва абураючае становішча мы маем з адзіным на Беларусі ільнаводна-пяньковым тэхнікумам у Лужасьне. Пакуль Ільнацэнтр і Наркамзем БССР вырашаюць пытаньне, каму ён павінен падпарадкавацца, **тэхнікум літаральна гіне.** У яго няма ні сродкаў, ні вытворчых плянаў, ні абсталяваньня...

Такое становішча ня можа быць цярпіма падалей.

У рэканструкцыйны пэрыяд праблема кадраў зьяўляецца рашаючай праблемай сацыялістычнага будаўніцтва. Необходны самы рашучы ўдар па галавацяпах, якія яўна ігнаруюць пастановы партыі і ўраду.

У справе падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў, у прыватнасьці—у падрыхтоўцы пастаўнікаў павінны быць забясьпечаны сапраўды бальшавіцкія тэмпы!

„Паміж небам і зямлёй"

У БССР існуе адзіны тэхнікум з ільнаводна-пяньковым ухілам—у Віцебскім раёне, у Лужасьне. Здавалася-б што да яго павінна была-б прыкавацца ўвага адпаведных устаноў, у першую чаргу—НКЗему БССР і НКАсьветы.

Але вось факты, якія сьведчаць аб адваротным. У свой час мяркавалася перадаць тэхнікум ільна-пяньковаму цэнтру СССР. Можа гэтая справа была-б і на дрэнная... Ды атрымалася так, што НКЗ БССР, пачуўшы аб гэтым, зусім «пачуў на лаўрах», надта задаволены, што тэхнікум вырваўся з-пад яго кіраўніцтва.

У той час, калі ўсе навучальныя ўстановы ўключаны ў каштарыс з пачатку новага гаспадарчага году, пра Лужасьненскі тэхнікум НКЗ зусім забыўся і апошні па сёньнішні дзень «паміж небам і зямлёй». Тэхнікум ня мае грошай ня толькі на якое-небудзь спэцыяльнае абсталяваньне, але нават, каб выдаць зарплату выкладчыкаму і тэхнічнаму пэрсаналу, каб забясьпечыць стыпэндыямі студэнтаў.

А між тым у тэхнікуме было 10 тыс. руб., адпушчаных на спэцыяльнае абсталяваньне. Усю гэту суму перавялі НКЗему з надзеяй, што Ільнацэнтр СССР забярэ тэхнікум і сам адпусьціць грошы. Цяпер-жа—ні грошай, ні абсталяваньня.

Дрэнна і з арганізацыйна-мэтадычным кіраўніцтвам. Некалькі раз складаліся пэрспэктыўныя і вытворчыя плёны, але ніхто пра іх лёс ня ведае. Няма дырэктар тэхнікуму быў у НКЗеме і дагаварыўся афіцыяльна, што трэці курс трэба выпусьціць да 1-га сакавіка. Праз некалькі дзён у НКЗ паехаў адзін з аграномаў тэхнікуму; яму там сказалі, што трэці курс будзе выпушчан 15-га сакавіка.

Цяпер тэхнікум у надзвычай крытычным становішчы. Ільнацэнтру ён не перададзены...

НКЗем БССР павінен зараз-жа ўжыць усе захады для забясьпечэньня належных умоў падрыхтоўкі так патрэбных нам кадраў ільнаводаў.

Калектыў выкладчыкаў.

Так нельга!

БОЛЬШАЯ ЧАСТКА СТУДЭНТАЎ МАЗЫРСКАГА ПЭДТЭХНІКУМУ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ВЕЛЬМІ ДРЭННЫХ МАТАР'ЯЛЬНЫХ УМОВАХ. НЕКАТОРЫЯ СТУДЭНТЫ РАЗЬМЕШЧАНЫ Ў ДРЭННЫХ КВАТЭРАХ, ДЗЕ НЯМА НІ СЬВЯТЛА, НІ ВАДЫ. НІЖНІЯ ПАВЕРХІ—СЫРЫЯ.

СТУДЭНЦТВА НА ЗІМУ ЗУСІМ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНА ВОПРАТКАЙ І АБУТКАМ, ШТО ЗРЫВАЕ ЦЯПЕР ЗАНЯТКІ.

ПАБУДОВА ІНТЭРНАТУ, ПАВОДЛЕ ЗАЯВЫ ДЫРЭКТАРА, ПАВІННА БЫЛА СКОНЧЫЦЦА Ў СЬНЕЖЬНІ, АЛЕ ВІДАЦЬ І ПРАЗ ДВА МЕСЯЦЫ ІНТЭРНАТ НЯ БУДЗЕ ГАТОВЫ. АБ ХУТЧЭЙШАЙ НАБУДОВЕ АДМІНІСТРАЦЫЯ ТЭХНІКУМУ НЕ КЛАПОЦІЦЦА.

МАЗЫРСКІ ЦРК НЯ ХОЧА ВЫДАВАЦЬ СТУДЭНТАМ АБУТКУ ПА ТАЛЁНАХ.

У ВЫНІКУ ЎСЯГО ГЭТАГА НАЗІРАЕЦЦА ЛЯТУНСТВА, ІМКНЕНЬНЕ ЎЦЯЧЫ З ТЭХНІКУМУ.

СВОЯ.

Праз месяцы два трэсьне лёд,

а ЦРК яшчэ не пачаў па-дзелавому рыхтавацца да гароднай кампаніі

Пад шырмай „аб'ектыўных" прычын рыхтуецца зрыў забесьпячэньня рабочых гароднікай

Пралетарская грамадзкасьць павінна ўмяшацца ў гэту справу

Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)В даў выразную дырэктыву—устанавіць асаблівы кантроль над ходам будаўніцтва прыгарадных гаспадарак, забясьпечыць выкананьне плянаў засеву агародаў рабочай каапэрацыі па плошчы 25.000 гэкт. Для выкананьня гэтай важнейшай дырэктывы патрэбна шырокая растлумачальная работа як па лініі каапэрацыі, так і па лініі парт. і прафарганізацыі ў рабочых масах. Між тым гэта работа ў нас разгортваецца яўсім нездавальняюча. Становішча у прыгарадных гаспадарках катастрафічнае.

Гомельскаму і Віцебскаму ЦРК да сёньняшняга дня не адведзены зямельныя фонды. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі Віцебску і Гомелю ня здолелі дабіцца своячасовага адводу зямлі для прыгарадных гаспадарак.

Ня лепш становішча і ў прыгарадных саўгасах Менскага ЦРК. Пляны, складзеныя ЦРК па засеве агародаў, да саўгасаў яшчэ не даведзены.

Прыгаравыя гаспадаркі павінны забясьпечыць рабочых Менску гароднінай на 70 проц. іх патрэбнасьцяй замест 10 проц. у мінулым годзе. Для гэтага МЦРК пакідае плошчу агародаў з 185 гэкт. да 1.220 гэкт.

Для засеву вызначанай плошчы патрэбна насеньне, а насеньня ў Менскага ЦРК ёсьць пакуль што вельмі мала. Напрыклад, насеньня раньняй бульбы ёсьць ня больш 30 проц., раньняй капусты—20 проц., гуркоў—ня больш 40 проц.

МЦРК павінен закласьці 10 тыс. парніковых рам. 20 студзеня гэта работа павінна была быць ужо скончана, між тым толькі цяпер пачалі капаньне катлаванаў. Каапэрацыяныя работнікі глумачаць гэта тым, што для вырабу парніковых рам ня было матар'ялаў. Ну, а для капаньня катлаванаў—чаго не хапала?

Не, тут справа не ў аб'ектыўных прычынах, а ў тым, што ЦРК не перабудаваў сваёй работы так, каб своячасова падрыхтавацца да веснавой пасеўнай кампаніі.

У прыгаравых гаспадарак яшчэ не пачалі рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару.

У прыгарадных саўгасах трэба паставіць яшчэ 800 кароў, г. зн. давесьці іх колькасьць да 3.000. Давесьці колькасьць сьвінаматак да 1.200 штук, між тым ёсьць толькі 300 штук. На адкорм трэба паставіць 6.000 сьвіней, фактычна ёсьць 800.

Востра стаіць пытаньне аб памяшканьнях для жывёлы. Будаўніцтва разгортваецца чарапашнымі тэмпамі. Не хапае будаўнічага матар'ялу. Леспрамгас адпусьціў усяго 1.000 куба-мэтраў круглага лесу, і 400 куба-мэтраў рэзанага, між тым як для вырабу парніковых рам патрэбна 200 куба-мэтраў лесу. Але, ня гледзячы на такі востры дэфіцыт у будаўнічых матар'ялах, будаўнічы сэктар МЦРК не паклапаціўся нават прывезьці адпушчаны лес на месца будаўніцтва.

У прыгарадных гаспадарках не хапае таксама памяшканьняў для рабочых. Няма нават памяшканьня для забясьпечэньня сталых рабочых, якія працуюць у гаспадарках на сёньнішні дзень. Як можна расцэньваць такую маруднасьць? Не можна расцэньваць выключна як правану правай практыкі ў справе будаўніцтва прыгарадных гаспадарак.

ЦРК таксама не хапае цягавай сілы. ЦРК патрэбна 250 коняй у дадатак да тых, якія ёсьць. Восеньню коні былі таней і іх можна было купіць у выстарчальнай колькасьці. На гэта работнікі ЦРК адказваюць, што ўсёроўна коняй няма чым карміць, што корму хопіць толькі на 4-5 дзён.

Ці-ж могуць зьняць віну з работнікаў ЦРК такія заявы? А дзе-ж былі работнікі ЦРК раней, чаму яны не нарыхтавалі корму?

У такім становішчы прыгарадных гаспадарак вінаваты таксама прафсаюзы, якія абмежаваліся пасылкай брыгад і не правяраюць ні работы самых брыгад, ні работы ЦРК.

Прыгаравыя калгасы, якія знаходзяцца ў веданьні Менскага гарсавету, таксама яшчэ ня рыхтуюцца да сэўбы, яшчэ не пачалі нават ачыстку насеньня. Гарсавет не вядзе ніякай работы (апрача пыркулярнай) для арганізацыі новых калгасаў і прыліву ў старыя.

Шэфскія арганізацыі мала яшчэ зрабілі ў справе дапамогі прыгарадным калгасам.

Прыведзеныя вышэй факты і лічбы яснa кажуць аб тым, што каапэрацыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, а таксама Менскі гарсавет ня прымаюць рашучых мер па ўмаўненьні падрыхтоўкі да гароднай кампаніі, ставяць пад пагрозу зрыву забесьпячэньне рабочых гароднінай.

Вясна не за гарамі. Трэба неадкладна мабілізаваць, паслаць рамонтныя брыгады ў прыгаравыя саўгасы і калгасы. Пляны рабочай каапэрацыі павінны быць неадкладна абмеркаваны на прадпрыемствах.

А. М—ў.

Да выбараў тав. Горына прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук

Раньне прэзыдэнтам Беларускай Акадэміі Навук тав. Горына, бязумоўна, задаволіць усю партыйную, навукова-марксыцкую і савецкую грамадзкасьць. Прышоўшы ў навуковую работу з сялян - беднякоў Заходняй Беларусі, дзе і пачаў сваю партыйную бальшавіцкую работу, тав. Горын зьяўляецца цяпер выдатным навуковым работнікам марксыстам, прымае актыўны ўдзел у арганізацыі навукова - дасьледчых работ марксыстаў, а таксама і ў партыйнай рабоце. З цэлага раду надзвычай важных і грунтоўных навуковых работ тав. Горына ўкажам на наступныя: «Очерки по истории советов рабочих депутатов в 1905 г.». У сучасны момант вышла другое дапоўненае выданьне (508 стар.). «Пролетариат в 1917 г. в борьбе за власть» (118 стар.). «Организация и строительство Советов Р. Д. в 1917 г.». Зборнік матар'ялаў пад рэдакцыяй з прадмовай і ўвагамі П. О. Горына. «Таблицы по истории ВКП(б) и рев. движения». (Суаўтар М. Тамаркін), ч. 1-я. Выйшла 3-е выданьне 1927, 28, 29 г. г. «Очерки по истории Советов Р. Д. в 1917 г.». Том 1-шы «Советы Р. Д. в период первого временного правительства». Разьмер каля 25 друкав. аркушаў заканчваецца падрыхтоўкай да друку ў гэтым годзе.

У прыватнасьці, работа тав. Горына «Советы в 1905 году», якая выйшла ў 1925 г., прадстаўляе сабою значны ўклад у гістарычнай навуцы. На падставе абагуленага, упяршыню дасьледванага матар'ялу, аўтар разгарнуў карціну дзейнасьці саветаў, даў цэлы рад новых установак і высунуў рад праблем якія абмяркоўваюцца цяпер вельмі шырока ў марксыцкіх навуковых колах. Зараз гэта кніжка ў нанава перапрацаваным выглядзе выйшла другім выданьнем. Другая работа тав. Горына, напісаная аб пралетарыяце ў рэвалюцыі 1917 г., адыграла таксама даволі значную ролю ў пашырэньні погляду на падрыхтоўку і ход Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Нельга не ўказаць таксама і на артыкулы, якія мелі значны ўплыў на паглыбленьне адпаведных праблем. Укажам, напрыклад, на такія артыкулы:

1) «Советы Р. Д. и социал - демократии в 1905 г.», «Записки Ком. Университета имени Свердлова», т. II, за 1925 год. 1—1½ друк. арк. 2) «Чем же были советы Р. Д. в 1905 г.» — журн. «Историк - Марксист», 1926 г., т. 1-шы, 2 друк. арк., 3) «Ошибки истории и непогрешимость Л. Троцкого» (адказ Л. Троцкаму на яго крытыку нашай работы), «Очерки по истории Советов Р. Д. в 1905 г.», журн. «Пролетарская Революция» № 6 (65) за 1927 г., больш 1 друк. аркушу. 4) Да пытаньня аб трацкісцкай ацэнцы рухомых сіл ліквідацыі 1917 г. журн. «Пролетарская революция» № 3 (74) за 1928 год, больш 1 друк. аркушу. 5) Аб ролі пралетарыяту ў рэвалюцыйным руху Украіны. Журн. «Большевик» за 1930 год № 1.

Усім вядома роля тав. Горына ў яго літаратурнай барацьбе з рознымі ўхіламі ў марксыцкай гістарыяграфіі. Даволі адзначыць прапішоўшую з вялікім пад'ёмам вельмі шырокую дыскусію аб народавольстве. У гэтай дыскусіі тав. Горын адыграў значную ролю і правёў рашучае змаганьне з канцэпцыяй Тэадаровіча.

Барацьба з канцэпцыяй Яворск[illegible] яворшчынай па пытаньні аб марк[illegible]кай схэме ў гісторыі Украіны вя[illegible] па ініцыятыве і пры самым непа[illegible]ным кіраўніцтве тав. Горына. Тав. [illegible]рын увесь час знаходзіўся ў рэда[illegible] «Историк-Марксист» і адыграў буй[illegible] ролю па рэарганізацыі часопісі «Пр[illegible]тарская революция» у напрамку п[illegible]тварэньня яе ў навукова - дасьлед[illegible] часопісь па гісторыі партыі. Кас[illegible]ніцкай рэвалюцыі і гісторыі Камін[illegible]ну. Трэба ўказаць на глыбокую [illegible]тыйнасьць раду артыкулаў, зьмеш[illegible]ных тав. Горыным у гэтых часопіся[illegible]

Да непасрэднай навуковай дзейн[illegible]ці тав. Горына неабходна аднесьці [illegible]лікую навукова - арганізацыйную [illegible]боту, якую ён правёў па цэлым ра[illegible] лініі. Тав. Горын зьяўляецца адны[illegible] ініцыятараў стварэньня таварыс[illegible] гісторыкаў-марксыстаў пры Камуністычнай Акадэміі. На працягу ўсяго [illegible]рыяду існаваньня таварыства гісто[illegible]каў-марксыстаў тав. Горын зьяўля[illegible] членам савету і вучоным сакрата[illegible] гэтага таварыства. Першая канфар[illegible]цыя гісторыкаў-марксыстаў СССР і [illegible] арганізацыя, як адзначыў тав. Пакр[illegible]скі ў сваім выступленьні, зьяўляе[illegible] нясумненнай заслугай тав. Горына.

Тав. Горын за апошнія гады пра[illegible]дзіў вялікую навукова - пэдагагічн[illegible] работу ў Маскоўскім Дзяржаўным У[illegible]вэрсытэце, у якасьці прафэсара па г[illegible]торы народаў СССР, і ў Інстыту[illegible] Чырвонай Прафэсуры, у якасьці кіра[illegible]ніка сэмінарамі. У сувязі са сваёй г[illegible]дагагічнай работай тав. Горын напіс[illegible] рад артыкулаў мэтадычнага характар[illegible] накіраваных супорць дробна - бурж[illegible]азных плыняй у мэтодыцы выкладан[illegible]ня гісторыі.

Калі да ўсяго сказанага дадамо, ш[illegible] работы тав. Горына перакладаюцца [illegible] па чужаземныя мовы (вышла на фра[illegible]цускай мове кніга «1905 год»), дык м[illegible] будзем мець амаль поўны малюн[illegible] даволі вялікай работы, праробленай та[illegible] Горынам як у галіне навукова-дас[illegible]ледчай, так і ў навукова - арганізацы[illegible]най. Гэта служыць гарантыяй, што та[illegible] Горын на пасту прэзыдэнта Бедару[illegible]кай Акадэміі навук здолее ня толь[illegible] арганізаваць навукова - дасьледч[illegible] работу, але і павесьці гэту работу п[illegible] тым рэчышчы, якое забясьпечвае у[illegible]мацненьне дыктатуры пралетарыят[illegible] праз навуковы досьлед, карыстаючыс[illegible] марксыцка-ленінскай мэтадалёгіяй. Та[illegible] Горын, апрача таго, што выконваў ва[illegible]лікую партыйную работу па даручэнь[illegible]ні ЦК УсеКП(б), заўсёды зьвязваў на[illegible]вуку з партыйнай работай. Ва ўсёй сва[illegible]ёй навуковай і навукова-арганізацыйн[illegible]кай рабоце ён заўсёды адстойваў за[illegible]бесьпячэньне правядзеньня генэральна[illegible] лініі партыі і партыйнасьць у навуцы[illegible] Толькі пад сьцягам марксыцка-ленін[illegible]скай мэтадалёгіі ёсьць магчымасьць падняць работу БАН на сапраўдны[illegible] навуковую вышыню, толькі пад сьця[illegible]гам марксыцка-ленінскай тэорыі можна [illegible]забясьпечыць пралетарскі зьмест бела[illegible]рускай культуры. Уся мінулая дзей[illegible]насьць тав. Горына дае нам упэўне[illegible]насьць у тым, што пад яго кіраўніцт[illegible]вам уся работа БАН пойдзе іменна па [illegible]гэтым марксыцка-ленінскім навукова-дасьледчым шляху.

В. Сэрбэнта.

ЛЁЗЬНЕНСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ 80 проц. гадавога пляну загатовак ільну

БОЛЬШАСЬЦЬ РАЁНАЎ МАРУДЗІЦЬ СА СПАГНАНЬНЕМ ІЛЬНУ З КУЛАКОЎ

Зламаць кулацкі сабатаж. Даць адпор спажывецкім тэндэнцыям калгасаў

Загатоўкі ільну ўсё яшчэ разгортваюцца злачынна марудна. Пачынаючы з сярэдзіны

ГЭТА НЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ РАШЭНЬНЕ

Барысаўскі райком партыі ня здолеў пераключыцца на ліквідацыю палітычных прарываў, правільна па-бальшавіцку арыентаваць і мабілізаваць масы на змаганьне за генэральную лінію партыі, на выкарчоўваньне праяў апартуністычнай практыкі, на разгортваньне пралетарскай самакрытыкі

СВАЁЙ ПАСТАНОВАЙ ПЛЕНУМ РАЙКОМУ ЗМАЗАЎ ВЫСОКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ФАКТАЎ, АБ ЯКІХ СЫГНАЛІЗАВАЛА „ЗЬВЯЗДА"

Замест самакрытыні—самастрахоўка

Сёньня мы зьмяшчаем досыць падрабязную справаздачу АБ РАБОТАХ ПЛЕНУМУ БАРЫСАЎСКАГА РАЙКОМУ КП(б)Б. Гэты пленум па сутнасьці быў прысьвечан абмеркаваньню тых палітычных прарываў, якія па віне раённага парткіраўніцтва мелі месца на радзе важнейшых вучасткаў работы Барысаўскай арганізацыі. «Зьвязда» (№ 24 ад 26-I 31 г.) аб гэтых прарывах сыгналізавала, дала ім досыць поўную палітычную ацэнку, зрабіла з іх пэўныя вывады.

У нашу задачу ўваходзіць — праачыць на работах пленуму, як раённае парткіраўніцтва і арганізацыі цапкам пераключыліся на ліквідацыю гэтых прарываў, наколькі яны мабілізаваны пленумам на змаганьне за генэральную лінію партыі супроць правых і «левых» ухілістаў, на выкарчоўваньне праяўленьняў праваапартуністычнай практыкі, на разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі. Адказ на гэтыя пытаньні мы павінны шукаць у напрамку і зьмесьце работ пленуму, у прыватнасьці ў яго пастанове, якая павінна была зьвяцца магутным фактарам, мабілізуючым шырокія партыйныя масы на выкананьне памянёных задач.

Аб тым, з якой актыўнасьцю праходзілі работы пленуму (удзел у якіх бралі і шырокія масы партактыву) гаворыць хоць-бы той факт, што ў спрачках выступалі амаль усе сэкрэтнікі работ пленуму. Аб тым, наколькі шырока была разгорнута жорсткая бальшавіцкая самакрытыка, паказвае тое, што абсалютная большасьць выступаўшых імкнулася выкрыць і выкрывалі рад новых недахопаў у рабоце арганізацыі ў цэлым і ў рабоце кіраўніцтва ў прыватнасьці. Амаль усе выступаўшыя ў спрачках УДЗЕЛЬНІКІ РАБОТ ПЛЕНУМУ ПРЫЗНАЛІ АБСАЛЮТНА ПРАВІЛЬНЫМІ ФАКТЫ, ПАДАНЫЯ Ў КАРЭСПАНДЭНЦЫІ «ЗЬВЯЗДЫ» «Трывожны сыгнал з Барысава», канстатаваў наяўнасьць праваапартуністычнай практыкі, факты грубога заціску самакрытыкі і бюракратызму ў раённым парткіраўніцтве. Адначасова выступаўшыя таварышы патрабавалі ад пленуму рашучых арганізацыйных мер у адносінах апартуністаў і душыцеляў самакрытыкі.

Здавалася-б, што такі зусім правільны напрамак работ пленуму ў сваім рэзультаце дасьць правільную палітычную арыентацыю партыйным масам, мабілізуе іх на штурм прарываў, якія выкрыты ў арганізацыі. Аднак, рэзультат мы маем зусім не такі, якога трэба было чакаць.

Пастанова пленуму, між іншым, досыць супярэчлівая сама па сабе і да таго-ж ня зусім палітычна-пісьменная, ня толькі не мабілізуе масы. А ЗАБЛЫТВАЕ ІХ І НЯПРАВІЛЬНА АРЫЕНТУЕ Ў ПЫТАНЬНЯХ ЗМАГАНЬНЯ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ.

Пачнем хоць-бы з таго, што пленум «ПРЫЗНАЕ ПАЛІТЫЧНУЮ І АРГАНІЗАЦЫЙНУЮ ЛІНІЮ (бюро РК КП(б)Б—РЗД.) У АСНОЎНЫМ ПРАВІЛЬНАЙ У БАРАЦЬБЕ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ І АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ ЗАДАЧ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, У БАРАЦЬБЕ З ПРАВЫМ АПАРТУНІЗМАМ, ЯК ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ, «ЛЕВЫМ» АПАРТУНІЗМАМ І ПРЫМІРЭНЦТВАМ ДА ІХ» і ні слова не гаворыць аб наяўнасьці элемэнтаў праваапартуністычнай практыкі, апартуністычнай стаўкі на самацёк у рабоце парткіраўніцтва. Толькі ў пунктах 5 і 7 пленум адарвана ад агульнай ацэнкі лініі і дзейнасьці райкому «адзначае, што бюро РК несвоячасова рэагавала на апартуністычны матар'ял да справаздачы гараджога савету», «спозьненае рэагаваньне з боку РК на сыгналы друку аб становішчы працы ЦРК... праяўленьне правага ўхілу ў практычнай працы ЦРК». Замест таго, каб назваць гэтыя спазьненьні» РК сваім палітычным імем, каб на падобнага роду праявах апартуністычнай практыкі, з боку кіраўніцтва РК, мабілізаваць партыйныя масы, ПЛЕНУМ НЯ ЎЛІЧЫЎ ГЭТЫХ «СПАЗЬНЕНЬНЯЎ» РАЙКОМУ НАВАТ ПРЫ АЦЭНЦЫ ЯГО ПАЛІТЫЧНАЙ ЛІНІІ І ДЗЕЙНАСЬЦІ. Бо пры ўліку гэтых па сутнасьці патураньняў райкому апартуністам з ЦРК і гарсавету, пры ўліку шматлікіх іншых палітычных промахаў райкому, фактаў грубага заціску самакрытыкі кіраўнікамі райпартарганізацыі АБМЕЖАВАЦЦА «ПРЫЗНАНЬНЕМ ПАЛІТЫЧНАЙ І АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ ЛІНІІ Ў АСНОЎНЫМ ПРАВІЛЬНАЙ» ІЛІ ЯК НЕМАГЧЫМА. Гэта можна зрабіць толькі забыўшы гэтыя моманты або адклаўшы іх далей ад сябе для таго, каб потым, недзе пад канец, у рэзалюцыі аб іх скромна, між іншым, для самастрахоўкі, успамянуць. Так іменна і рэдагавана пастанова пленуму.

Пастанова пленуму прызнае палітычную і арганізацыйную лінію райкому ў асноўным правільнай. У гэтым-жа пункце прызнана правільнай і карэспандэнцыя «Зьвязды» «Трывожны сыгнал з Барысава». Якая глыбокая супярэчнасьць у адным і тым-жа пункце рэзалюцыі. Якія супярэчлівыя два палажэньні, дзьве фразы, што аддзелены адна ад другой толькі адным знакам прыпынку.

Пленум прызнаў карэспандэнцыю «Зьвязды» правільнай бяз усякіх агаворак. Значыцца, прызнана правільным і тое палажэньне, што «прарывы, якія стварыліся на важнейшых вучастках работы, зьяўляюцца вынікам нездольнасьці Барысаўскага парткіраўніцтва ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі, прычынай наяўнасьці ў складзе РК апартуністычных элемэнтаў, якія не сустракалі бальшавіцкага адпору ўнутры райкому».

А што сказала пастанова наконт гэтага, прызнанага ёю, правільнага абзацу артыкулу «Зьвязды»?

Пастанова аб гэтым не сказала ні слова.

Такім чынам будзе зусім правільным, калі мы паставім пытаньне аб тым, наколькі шчыра прызнана правільнасьць артыкулу «Зьвязды», наколькі пастанова сваім зьместам пацьвярджае гэта прызнаньне. Зьмест пастановы, якая прызнае правільнай карэспандэнцыю «Трывожны сыгнал з Барысава» прымушае нас канстатаваць, што ГЭТА ПРЫЗНАНЬНЕ ТОЛЬКІ ФАРМАЛЬНАЕ, ШТО ГЭТА ПРЫЗНАНЬНЕ СУЦЭЛЬНАЯ АЛІЛЮЙШЧЫНА, ПРЫКРЫЎШЫСЯ ЯКОЮ ЗМАЗВАЮЦЦА Ў ПАСТАНОВЕ ГРУБЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ, ПА СУТНАСЬЦІ АПАРТУНІСТЫЧНЫЯ, ПАМЫЛКІ КІРАЎНІЦТВА БАРЫСАЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ. У АДНОЛЬКАВАЙ СТУПЕНІ ЗМАЗАНЫ І ФАКТЫ ЗАЦІСКУ САМАКРЫТЫКІ З БОКУ КІРАЎНІКОЎ РАЙКОМУ. Пастанова пленуму наконт гэтага абмяжоўваецца толькі ўхваленьнем факту скасаваньня бюро РК і прэзыдыумам РКК сваіх пастаноў ад 4/XII 30 г. і 14/I 31 г., ухваленьнем таго, што Сасноўскі зрабіў заяву аб прызнаньні дапушчанай ім палітычнай памылкі, якая выявілася ў канфіскацыі лістка «Каапэрацыйнае жыцьцё». І ўсё. Па гэтым пытаньні пастанова не гаворыць нічога апрача зноўтакі канстатаваньня «значнага спазьненьня». Як быццам гэтым вычэрпваецца той ганебны факт заціску самакрытыкі, які выявіўся ў канфіскацыі лістка выязной рэдакцыі «Каапэрацыйнае жыцьцё». У даным выпадку ПАСТАНОВА ЗНОЎ НЕ АДВАЖЫЛАСЯ НАЗВАЦЬ ФАКТ ГРУБОГА ЗАЦІСКУ САМАКРЫТЫКІ СВАІМ ІМЕМ. ЗНОЎ ЗМАЗАНА ПАЛІТЫЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ФАКТАЎ ГРУБАГА СКАЖЭНЬНЯ ЛЁЗУНГУ ПАРТЫІ АБ РАЗГОРТВАНЬНІ САМАКРЫТЫКІ, ЯКОЕ ПРАЯЎЛЕНА З БОКУ КІРАЎНІКОЎ АРГАНІЗАЦЫІ.

Барысаўская арганізацыя была, ёсьць і будзе верным і баяздольным атрадам КП(б)Б, актыўным барацьбітом за генэральную лінію партыі. Барысаўская арганізацыя выправіць і гэту памылку сваіх кіруючых органаў, таксама як па-бальшавіцку яна змагалася на працягу ўсяго пэрыяду разам з усёй КП(б)Б за выразнае праводзьленьне генэральнай лініі партыі супроць усялякіх ухілаў ад ленінізму як управа, так і «ўлева».

Барысаўская арганізацыя будзе з бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за разгортваньне жорсткай пралетарскай самакрытыкі, накіроўваючы яе вострасьць супроць правых апартуністаў, «левых» загібшчыкаў, душыцеляў самакрытыкі і бюракратаў, якія тармозяць ажыцьцяўленьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

На пленуме Барысаўскага РК і райКК

Зьмешчаны 26 студзеня ў «Зьвязьдзе» артыкул «Трывожны сыгнал з Барысава» прымусіў кіраўніцтва барысаўскай раённай арганізацыі ўзварушыцца.

Аб'яднанае насяджэньне бюро РК і прэзыдыуму райКК прызнала, што артыкул «Зьвязды» цапкам адпавядае сапраўднасьці становішча работы арганізацыі і кіраўніцтва. На гэтым насяджэньні былі скасаваны пастановы РК і прэзыдыуму райКК ад 4 сьнежня 1930 году і 14 студзеня 1931 году, у якіх змазвалася пытаньне аб заціску самакрытыкі работнікамі райкому, на чале з сакратаром РК Сасноўскім.

Пытаньне аб рабоце райкому абмяркоўвалася на аб'яднаным пленуме РК і райКК разам з партактывам.

Здавалася, што пасьля выкрытых прарываў, пасьля прынятай пастановы бюро РК і прэзыдыумам райКК аб правільнасьці зьмешчаных у «Зьвязьдзе» матар'ялаў, ад тав. Сасноўскага, які рабіў даклад на пленуме аб рабоце РК, сьледавала чакаць, што даклад будзе пабудаваны на бальшавіцкім прызнаньні памылак, на выкрыцьці карэньняў, якія прывялі да буйнейшых прарываў на ўсіх вучастках работы. Аднак, даклад быў зьведзен толькі да дзьвёх формул—«шмат дасягненьняў» і «шмат недахопаў». Зразумела, што гэты даклад, як паказалі спрэчкі, ні ў якай меры не задаволіў удзельнікаў пленуму. Праўда, Сасноўскі ў заключным слове, пад напорам актыву, прымушан быў прызнацца ў сваім ухіленьні ад адказу на сутнасьці на высунутыя «Зьвязьдой» пытаньні.

На працягу трох дзён амбяркоўваўся на пленуме даклад аб рабоце райкому партыі. Выступаўшыя ў спрэчках рэдам фактаў ня толькі пацьвердзілі сыгнал «Зьвязды» аб прарывах, але дадаткова выкрылі рад недахопаў у рабоце і недапушчальных бюракратычных учынкаў з боку Сасноўскага. Цэнтр увагі ўсіх спрэчак быў накіраваны на тое, што ў арганізацыі адсутнічае бальшавіцкая самакрытыка. У самым райкоме мелі месца абураючыя факты заціску самакрытыкі, што перашкаджала выкрыцьцю апартуністычнай практыкі, момантаў бюракратызму і іншых недаровых зьявішч. Выступаўшыя таварышы характарызавалі работу райкому патокам, рэзалюцый і цыркуляраў, бясконцых насяджэньняў і адсутнасьцю якой-бы там ні было праверкі выкананьня гэтых цыркуляраў, адсутнасьцю рэагаваньня з боку РК на факты апартуністычнай практыкі.

Член бюро РК — рабочы гуты імя Домбаля — тав. Герынгаў у сваім выступленьні адзначыў, што канфіскацыя лістка выязной рэдакцыі «Кооперативная Жизнь» зьяўляецца фактам заціску самакрытыкі. Прамоўца радам фактаў выкрываў праваапартуністычную практыку ў рабоце ЦРК, дзе ігнаравалісь дырэктывы партыі аб арганізацыі закрытых разьмеркавальнікаў, парушаўся прынцып клясавага разьмеркаваньня тавараў і спажывецкіх прадуктаў. Закрытыя рабочыя сталоўкі забясьпечваліся значна горш, чым адкрытыя. Наяўнасьць заціску самакрытыкі ў апараце ЦРК не давала магчымасьці своячасова выкрываць гэтыя недахопы. Партыйная і прафэсыянальная арганізацыі ЦРК сталі ў баку ад выкананьня дырэктыў партыі ў справе паляпшэньня рабочага забесьпячэньня. Райком не рэагаваў на апартуністычную практыку ў рабоце ЦРК.

— Дзесяткі прынятых пастаноў бюро РК і пленумам РК аб прыняцьці пашучых мер па ліквідацыі кіраўніцтва асобнымі фабрыкамі, аб разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва на прадпрыемствах, — гаворыць тав. Кроль (сакратар парткалектыву заводу «Камінтэрн»), спакойна ляжаць у папках райкому без выкананьня.

Райком партыі не зрабіў належных вываадаў з прарываў у выкананьні прамфінпляну за ўдарны квартал, не мабілізаваў партыйную арганізацыю і пралетарскую грамадзкасьць на пасьпяховае выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, у выніку ні на адным прадпрыемстве ня выконваецца прамфінплян за студзень месяц.

Факты заціску самакрытыкі, якія мелі месца ў ЦРК і іншых арганізацыях, своячасова не выкрываліся, ня ўхіляліся гэта пытаньне на прынцыповую вышыню і нават райком партыі ўчынкамі асобных членаў РК і пастановамі ад 4 сьнежня і 14 студзеня аказаўся на чале актыўных зажымшчыкаў самакрытыкі. Прамоўца радам фактаў пацьвердзіў наяўнасьць праваапартуністычнай практыкі ў рабоце ЦРК, на якую РК не рэагаваў нават пасьля зьмешчанага ў друку матар'ялу, усіляк адцягваў вырашэньне гэтага пытаньня, ня гледзячы на патрабаваньне грамадзкасьці даць адказ на становішча работы ў ЦРК.

Выступіўшы ў спрэчках тав. Прышчэп (старшыня райкалгасаюзу) прызнаў наяўнасьць стаўкі на самацёк у галіне калектывізацыі. Радам фактаў тав. Прышчэп ахарактарызаваў карэньні слабых тэмпаў нарастаньня калектывізацыі. Глівінская вясковая ячэйка, якая зьяўляецца самай буйнейшай у раёне, да апошняга часу пічлася аднэй з лепшых у раёне. Шмат раз гэту ячэйку наведвалі прадстаўнікі райкому і ў сваіх вывадах канстатавалі, што ў ячэйцы ўсё добра. Сакратар райкому партыі тав. Сасноўскі нават на адным з пленумаў ставіў, як прыклад, Глівінскую ячэйку, па якой рэкамэндаваў раўняцца іншым ячэйкам, у той час, калі ячэйка засьмечана чужымі элемэнтамі, калі ў радзе калгасаў кіруюць кулакі, ячэйка выстаўляла кандыдатуры ў члены сельсаветаў кулакоў, асобныя члены партыі і нават бюро мелі цесную сувязь з кулацтвам. У Касьцюковіцкім. Карсаковіцкім сельсаветах і ў радзе іншых не вядзецца ніякай барацьбы з мясцовым кулацтвам. калгасы гэтых сельсаветаў засьмечаны. Да гэтага часу ў 30 проц. калгасах раёну не праведзена размеркаваньне ўраджаю. Вясковыя партыйныя ячэйкі неыстарчальна кіруюць калгасным будаўніцтвам. стаяць у баку ад узносшай актыўнасьці бяднацка-серадняцкіх мас вёскі.

Тав. Філіпаў у сваім выступленьні завастрыў увагу на рабоце гарсавету. Выпуск праваапартуністычнай і дзяляцкай справаздачы не зьяўляецца адзіным фактам дрэннай работы гарсавету. Ня гледзячы на крытыку ў «Зьвязьдзе» апартуністычнай справаздачы гарсавету, райком не палічыў патрэбным рэагаваць на гэта.

Тав. Самцоў (гута імя Домбаля) гаварыў, што райком свае пастановы не даводзіў да партыйных мас. Калі было распушчана бюро парткалектыву гуты імя Домбаля за праваапартуністычную практыку, дык прадстаўнік ад РК утойваў ад партыйных мас пастанову бюро РК. Былы сакратар бюро парткалектыву накіраван на вучобу, а назначаны райкомам працуе ўжо калі 3-х месяцаў, ня будучы выбраным на сходзе парткалектыву.

Тав. Мілюкоў гаварыў аб апартуністычнай недаацэнцы з боку парт'ячэек работы з беднатой. Многія ячэйкі заяўлялі, што ў іх сельсаветах няма кулакоў у той час, калі мелася дзесяткі нявыяўленых кулацкіх гаспадарак.

Райком партыі часта перакідваў з аднаго сельсавету ў другі брыгадзіраў, якія працавалі на вёсцы, што адбівалася на іх рабоце на выяўленьні кулацтва.

Усе прамоўцы адзначалі, што ў арганізацыі адсутнічае самакрытыка па тых прычынах, што райком партыі ня толькі ня спрыяў разгортваньню самакрытыкі, але і заціскаў яе. Райком ня здолеў арганізаваць партыйныя масы і ўсю пралетарскую грамадзкасьць на выкананьне задач трэцяга году пяцігодкі. Райком перашуча змагаўся супроць апартуністычнай практыкі: калі на адным з пленумаў райкому асобныя таварышы сыгналізавалі аб адсутнасьці выстарчальнай барацьбы супроць права апартунізму, дык сакратар РК Сасноўскі ў заключным слове адказаў «Мы вядзем змаганьне з правым апартунізмам і вам ня варта было-б тут выступаць і гаварыць аб гэтым».

Выступіўшы ў спрэчках сакратар ЦК тав. Шаранговіч адзначыў, што «Зьвязда» правільна аллюстравала становішча работы барысаўскай раённай парткарганізацыі і яе кіраўніцтва, па-бальшавіцку выкрыла тыя прарывы, якія ёсьць на важнейшых вучастках работы.

Ударны квартал скончан з прарывамі. Буйныя прарывы на большасьці прадпрыемстваў гор. Барысава ёсьць і ў студзені месяцы. Тэмпы нарастаньня калектывізацыі вельмі слабыя. Партыйная работа да гэтага часу не перабудована, як належыць, у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Самакрытыка бальшавіцкая, пралетарская ня стала мэтадам барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Праверка выкананьня дырэктыў не пастаўлена на належную вышыню. Факт затрыманьня лістка выязной рэдакцыі газэты «Кооперативная Жизнь» зьяўляецца грубейшай палітычнай памылкай райкому, заціскам самакрытыкі.

Барысаўскай партыйнай арганізацыі патрэбна мабілізавацца і мабілізаваць усю рабочую грамадзкасьць на ліквідацыю прарываў у рабоце і забесьпячэньне выкананьня задач трэцяга году пяцігодкі.

Калгасы і саўгасы Заслаўскага раёну аказваюць вялікую садзейнасьць адзіаасобнікам у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. На здымку — адзіаасобнік прывезьлі ў калгас насеньне для ачысткі.

Апартуністы чакаюць,

што ім прывязуць насеньне на склады

22 РАЁНЫ НЕ ПРЫСТУПІЛІ ДА ЗАГАТОЎКІ НАСЕНЬНЯ КАРМАВЫХ ТРАЎ

Плян загатоўкі насенных траў па раёнах жывёлагадоўчага напрамку выкананы райкаапсаюзамі: па канюшыне — на 2,7 проц., цімафееўцы — 4,7 проц., віцы — 6,1 проц. і сэрадэлі — 0,38 проц. Такі тэмп загатовак ставіць пад пагрозу выкананьне пляну пасеваў траў і стварэньне кармавой базы для развіцьця жывёлагадоўлі.

22 раёны (з агульнага ліку 57 раёнаў жывёлагадоўчага напрамку) да загатовак кармавых траў зусім не прыступілі.

Некаторыя раёны чакаюць, што ім насеньне прывязуць на склады. Плян загатовак не даводзяцца да месц, а кулацка - заможная частка вёскі цьвёрдых заданьняў у значнай колькасьці раёнаў не атрымала.

Кліматычныя ўмовы спрыяюць разьвіцьцю пасеваў траў у жывёлагадоўчых раёнах. І ў мінулыя гады ў іх загатаўлялася насеньне. Так, раёны былых Магілеўскай, Гомельскай і Бабруйскай округ ня толькі задавальнялі ўнутраныя патрэбы, але і вывозілі насеньне кармавых траў у іншыя раёны. Між тым, зараз такія раёны, як Быхаўскі, Ветрынскі, Церахаўскі і Рэчыцкі заяўляюць, што ў іх няма чаго загатаўляць. Такія тэндэнцыі маюць месца у раёнах інтэнсыўнай жывёлагадоўлі, якія, даўно сеюць травы ня толькі на корм, але і на насеньне.

22 раёны, якія зусім не прыступілі да загатовак, не давялі пляну загатовак да паселішчаў і кулацка-заможных двароў. Рэшта раёнаў давяла пляны толькі фармальна, а ніякай работы па ўзмацненьні загатовак не вядзе.

Стаўка на самацёк, бязьдзейнасьць і надзеі на завоз насеньня, якія назіраюцца ў радзе райкаапсаюзаў, ня могуць быць інакш расцэнены, як праявы правага апартунізму ў справе вырашэньня кармавой базы.

Трэба прыняць самыя рашучыя меры, каб разгарнуць загатоўку кармавых траў і выканаць дырэктывы партыі і ўраду ў галіне стварэньня кармавой базы. Трэба па-бальшавіцку ўзяцца за баявое выкананьне загатоўчых пляноў. Ужо надыходзіць вясна, а выкананьне пляну складае мізэрны процант. У бліжэйшыя-ж дні неабходна давесьці пляны да паселішчаў і кулацка-заможных гаспадарак, мабілізаваўшы вакол гэтай задачы вясковую грамадзкасьць, уцягнуўшы ў работу групы беднаты, вясковы актыў.

Райкаапсаюзы павінны ісьці наперадзе і ўсьвядоміць, што яны ў першую чаргу адказваюць за выкананьне пляну загатовак насеньня кармавых траў.

Самая рашучая барацьба павінна быць абвешчана апартуністычнаму самацёку і бязьдзейнасьці ў галіне загатовак насеньня кармавых траў.

Журомскі.

Касьцюковіцкі раён

І'Е РАЗГАРНУЎ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ

Апартуністычныя тэндэнцыі скараціць пасеўную плошчу кармавых культур

Плян веснавой пасеўнай кампаніі на КАСЬЦЮКОВІЦКІМ РАЁНЕ яшчэ месяц таму назад быў даведзен да кожнага сельсавету і кожнага калгасу. Сельсаветы і калгасна - каапэрацыйная сыстэма атрымалі пэўныя дырэктывы аб разгортваньні падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Ня гледзячы на гэта за месяц у раёне вельмі мала зроблена для правядзеньня вызначаных пляноў у жыцьцё. Рад работнікаў сельсаветаў выявіў свой сапраўдны, апартуністычны твар пры давядзеньні пляноў веснавой сяўбы да калгасаў і паасобных гаспадарак. Наглядаецца тэндэнцыя скараціць пасеўную плошчу тэхнічных і кармавых культур.

СЯЛІЧОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ зьменшыў кантрольныя лічбы Райвыканкому па плошчы сіласных культур у 10 раз—з 25 гэкт. да 2,5 гэкт. Вызначаную пасеўную плошчу віні ў разьмеры 140 гэкт. сельсавет зусім скасаваў у пляне. Гэта гаворыць аб яўным ігнараваньні дырэктыў партыі і ўраду аб вырашэньні кармавой базы і пашыраньні плошчы кармавых культур за ніж папару.

Калгасы ня выконваюць дырэктывы райкалгасаюзу аб завозе папы з млыноў, і с.-г. машын са складаў каапсаюзаў у зімовы час. Партыйныя ячэйкі і сельсаветы гэтай справай таксама ня цікавяцца.

Спажывецкая каапэрацыя і каапсаюз не разгарнулі загатоўкі насеньня. Плян загатовак выканан усяго ў разьмеры 25-30%. Сельсаветы зусім не дапамагаюць загатоўчым арганізацыям. Дагэтуль ня даны цьвёрдыя заданьні кулацкім гаспадаркам.

Пляны пасеўнай кампаніі сельсаветамі ня толькі не даведзены да двара, а нават і да паселішча. Збожжаачышчальныя машыны ўстаноўлены амаль у кожным сельсавеце, але збожжа-ачыстка праходзіць вельмі марудна. Калі так будзе працягвацца і далей, ёсьць пагроза, што ўсё насеньне ня будзе ачышчана.

23-га студзеня на канфэрэнцыі пастаўнікаў у спрэчках на дакладу аб пасеўнай кампаніі амаль ніхто з асьвяцікаў ня выступіў. Гэта гаворыць аб тым, што настаўніцтва прымае яшчэ вельмі слабы ўдзел у падрыхтоўцы да сяўбы.

Нельга ня сьпяшыцца на тым, што некаторыя аграномы, якія прымацаваны да сельсаветаў, ня з усёй адданасьцю адносяцца да сваёй справы. Прыкладам гэтага можа служыць аграном тав. Васіленка, які быў у чатырох сельсаветах, але не пацікавіўся, як ідзе падрыхтоўка да веснавой сяўбы.

Сельсаветы зусім ня прысьвяцілі ўвагі аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы. Дагэтуль толькі 10 сельсаветаў адгукнуліся на неадназовыя напаміны.

Раённыя ўстановы не ўстанавілі яшчэ сталага кантролю над тым, як выконваюцца іх дырэктывы.

Адаменка.

Што даюць нарады па прафэсіях

Вынікі канфэрэнцыі гомельскіх ліцейшчыкаў—

ЛЕПШЫ ДОВАД ПРАВІЛЬНАСЬЦІ ПАСТАНОЎ 5-га ПЛЕНУМУ УсеЦСПС

Калі мы гаворым аб перабудове работы тварам да вытворчасьці, партыйнай ці прафсаюзнай, мы маем на ўвазе перанясеньне центру гэтай работы ва ўдарную брыгаду, каб вытворчыя нарады ахаплялі разгляд пытаньняў, якія датычаць паасобных вузкіх груп рабочых аднолькавай спэцыяльнасьці.

Апошні пленум УсеЦСПС, на якім вырашана пытаньне аб разбуйненьні прафсаюзаў, прадугледжвае якраз тое, каб прафсаюзы сталі бліжэй да мас, каб яны ад агульнага кіраўніцтва перайшлі да канкрэтнага, прыстасоўна да паасобных груп рабочых, каб гэта кіраўніцтва добра ведала ўмовы і працэсы работы данай групы рабочых.

Калі ў ліцейшчыкаў заводу «Пралетары» брак павялічыўся да 10 проц., ударнікі заявілі: «Гэта ганьба павінна быць змыта». Яны зразумелі, што галоўная прычына браку заключаецца ў тым, што яны ня ведаюць добрай работы, добрых вынікаў па іншых прадпрыемствах і што сабраць лепшы вопыт усіх прадпрыемстваў для барацьбы за якасьць прадукцыі зьяўляецца іх неадкладнай задачай.

Гэта было сказана роўна тры месяцы таму назад. Ці стала на чале гэтага пачынаньня гомельскае прафкіраўніцтва? З аднаго боку, здавалася, што так, бо пастанова аб скліканьні ўсебеларускай канфэрэнцыі была вынесена яшчэ з месяцы назад. З другога боку, патрабавалася вялікая грамадзкая і падрыхтоўчая работа з боку гомельскай газэты «Палеская праўда», каб гарпрафсавет зразумеў, што ў гэтым імённа заключаецца пакарот «тварам да вытворчасьці».

Калі гутарка пайшла аб скліканьні канфэрэнцыі ліцейшчыкаў па пытаньні аб зьніжэньні браку і паляпшэньні якасьці некаторыя прафработнікі заводаў казалі — «што гэта за пэхаўшчына?». Трэба лепш склікаць канфэрэнцыю рабочых усіх прадпрыемстваў па пытаньні аб якасьці. Такая пастаноўка пытаньня, калі сапраўдная перабудова прафработы ацэньвалася, як «пэхаўшчына», кажа з усёй выразнасьцю, што многія прафработнікі да гэтага часу не зразумелі, што такое паварот тварам да вытворчасьці.

Лепшым довадам гэтага зьяўляецца тая актыўнасьць і тыя вынікі, якія дала канфэрэнцыя ліцейшчыкаў.

Дэлегаты канфэрэнцыі поўнасьцю зразумелі задачы трэцяга году пяцігодкі і калі даклaдчыкі—майстры ліцейных цэхаў—прабавалі даказаць, што ў вялікіх процантах браку вінаваты аб'ектыўныя прычыны, дык яны спаткалі рашучы пралетарскі адпор і прымушаны былі ў заключных словах прызнаць свае памылкі.

Весь характэрнае выступленьне ліцейшчыка заводу імя Ланцуцкага тав. Ярчанка:

— Нашы майстры прабавалі тлумачыць вялікі брак выключна аб'ектыўнымі прычынамі — кепскі чыгун, кепскі вугаль, кепская зямля, няма лябараторыі і г. д. Я ў вас пытаюся, таварышы. Я таксама працую на гэтым кепскім чыгуне, кепскім вугалі і г. д. А ў мяне за 6 месяцаў ня было фунта браку. Гэта сьведчыць аб тым, што нашы майстры ня ведаюць сапраўдных прычын браку, а яны гэта абавязаны ведаць...

Тут-жа тав. Ярчанка прывёў шмат прычын — сапраўды суб'ектыўных, якія кажуць аб тым, што брак можна давесьці да нуля.

На канфэрэнцыі было звыш 35 выступленьняў, накіраваных у адзін бок. Гэтыя выступленьні дашчэнту разьбілі апартуністычную стаўку на «аб'ектыўныя» прычыны. Тут ужо ніякім дакладам, ніякім тэорыям ня зьвесьці з правільнага шляху тых, хто дзесяцігодзьдзямі працуе на гэтай рабоце. Вось корань таго, што канфэрэнцыя хутка выкрыла тых, хто хацеў захаваць сапраўдныя прычыны браку.

Канфэрэнцыя паказала яшчэ адну вельмі характэрную і каштоўную дэталь: яна выклікала актыўнасьць сярод тых рабочых, якія на канфэрэнцыях «нагул» ня прывыклі выступаць. Вось яшчэ адно характэрнае выступленьне ліцейшчыка заводу імя Ланцуцкага тав. Архіпенкі:

— Я ўпяршыню выступаю ў спрэчках. Але тут я не магу стрымацца, бо на канфэрэнцыі гаворяць аб кроўным маім пытаньні, па якім я працую пару дзесяткаў год. Я павінен адказаць нашым майстром, што яны ня ведаюць сапраўдных прычын браку...

Далей тав. Архіпенка расказвае, чаму ў іх пасаваана 19 буксаў. Канчае ён сваё выступленьне наступным:

— Таварышы, тут, на выстаўцы, ёсьць адна дэталь, якая папсавана па мэёй віне. Я гэта прызнаю, абяцаю што больш да мане гэтага ня ўбачуце.

Так загаварыў рабочы-ўдарнік, які да гэтага часу ніколі не выступаў. Вострасьць пастаўленага пытаньня на канфэрэнцыі прымусіла яго выступіць, бо ён быў упэўнен, што яго ўсе зразумеюць і нават тады, калі ён ужываў спэцыяльна ліцейныя тэрміны—«кізэл», «саллат», «ваўчок»—ніхто з гэтага ня дзівіўся.

Недарма ў рэзалюцыі дэлегаты патрабавалі скліканьня такіх-жа канфэрэнцый хоць-бы раз у поўгода.

Мы ў гэтым артыкуле не расказалі аб практычных прапановах, прынятых канфэрэнцыяй. Аб іх можна меркаваць з рэзалюцыі. Наша мэта—у гэтым артыкуле расказаць прафработнікам, як трэба перайсьці ад агульных пытаньняў да канкрэтных, перабудаваўшы работу згодна дырэктыў 5-га пленуму УсеЦСПС.

Б. ЗЭЛЬМАНАЎ.

Барацьбу за якасьць—нарэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Прапановы гомельскіх ліцейшчыкаў павінны быць абмеркаваны ўсімі мэталяапрацоўчымі прадпрыемствамі

Будзем моцна трымаць гаданровы сьцяг

(Рэзалюцыя мітынгу рабочых заводу „Камунар")

Заслухаўшы інфармацыю аб прысуджэньні нашаму заводу сьцягу імя ЦК ЛКСМБ, рабочыя заводу адзначаюць, што гакаючы правільная генэральная лінія партыі і правільнаму кіраўніцтву нашае партарганізацыі, бязьлітасная барацьба з правым ухілам як у тэорыі, так і на практыцы, і іншымі відамі апартунізму, мабілізуючы рабочыя масы заводу на выкананьне бальшавіцкіх тэмпаў работы мэтадам сацспаборніцтва і ўдарніцтва, мы дабіліся значных посьпехаў па ўсіх паказальніках і атрымалі магчымасьць стаць у рады лепшых прадпрыемстваў БССР і атрымаць пераходны сьцяг імя ЦК ЛКСМБ.

Уступаючы ў трэці рашаючы год пяцігодкі, які павінен завяршыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР, мы, рабочыя заводу «Камунар», у трэцім годзе пяцігодкі, замацоўваючы нашы дасягненьні, не ослабляем сваіх тэмпаў работы па выкананьні прамфінпляну трэцяга году пяцігодкі.

Указваючыся ў паход за якасьць, мы сапраўды павядзем рашучую барацьбу за бальшавіцкую якасьць прадукцыі.

Мы запэўніваем ЦК КП(б)Б і ЛКСМБ, што моцна будзем трымаць сьцяг, каб больш рашуча весьці барацьбу за генэральную лінію партыі і выкананьне пляну вялікіх работ трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Праграма барацьбы за якасьць

(З рэзалюцыі гомельскай канфэрэнцыі ліцейшчыкаў)

Канфэрэнцыя канстатавала, што пралетарыят Гомельшчыны пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе ЦК мае вялізарныя посьпехі ў разьвіцьці прамысловасьці. Аднак, у выкананьні якасных паказальнікаў ёсьць значныя прарывы. Сабекошт прадукцыі зьнізіўся за апошнія два гады на 15 проц. супроць 19, паводле пляну. Гэта каштавала прамысловасьці паўтара мільёна рублёў. Але зусім абураючае становішча назіраецца ў справе якасьці прадукцыі. З году ў год расьце брак: па заводзе «Пралетары» брак па чыгуна-ліцейным цэху складаў у 1928 годзе 3

М. Б. Кроль

Актуальныя пытаньні вышэйшай мэдычнай асьветы*)

II.

Лістападаўскі пленум 1929 году ЦК УсеКП(б) і студзеньскі пленум 1930 г. ЦК КП(б)Б паставілі ва ўвесь рост пытаньні аб падрыхтоўцы кадраў. За год, які прайшоў з таго часу, уся вышэйшая мэдычная асьвета ў БССР ня толькі перабудавана радыкальна, згодна дырэктывам партыі, але мы набылі і значны матар'ял, які далкам падкрэсьлівае правільнасьць тых шляхоў, на якія стала вышэйшая мэдычная школа. За гэты год у нас таксама накапілася досыць матар'ялу адносна нашых слабых месц і паказаньняў для іх зьнішчэньня. Мэдфак БДУ разгарнуўся ў самастойны мэдычынскі інстытут, паспаралельны НКАЗ. Шляхам працягненьня навучальнага году ўвесь курс навучаньня зведзены з пяці да чатырох год. Рацыяналізацыя навучальных плянаў, зьнішчэньне лекцый, актывізацыя выкладаньня, скарачэньне марфалёгічных дысцыплін у карысьць фізіялёгічных арганізацыя вытворчага практыкуму, увядзеньне цыкляльнай сыстэмы з адначасовым выкладаньнем на больш двух прадметаў, узмацненьне дысцыпліны, нарэшце, сапраўдаборніцтва і ўдарніцтва, якія толькі пачынаюць разгортвацца ў нас, у мэдінстытуце, — усё гэта ў выстарчальнай ступені ўзьняло і якасьць усваеньня, асабліва па малодшых курсах, дзе ўвядзеньне гэтых новых прынцыпаў сустрэла найбольш падыходлячую глебу. Нельга казаць, што рэформа яе сустрэла супраціўленьня з боку некаторых выкладчыкаў, якія пад гіпнозам старых акадэмічных тралыцый лічылі, што зьнішчэньнем лекцый ён роля ў сучасны момант у вышэйшай школе зьведзена да нуля. Былі і выказваньні з боку студэнцтва, што новыя тэмпы зьніжаюць якасьць. Набыты намі вопыт падкрэсьліў ужо неабгрунтаванасьць падобных гутарак. Раней навучальны год фактычна за выключэньнем залікавай сэсіі, працягваўся на больш 7 месяцаў, г. зн. 21 дэкаду, а за 5 год—105 дэкад. Зараз навучальны год даведзен да 32 дэкад, а за 4 гады —да 128 дэкад, з неравышэньнем на 23 дэкады, г. зн. на 7 з паловай месяцаў. Калі і вылічыць некалькі месяцаў на вайсковую падрыхтоўку, дык застанецца нейкі абытак у параўнаньні з вышэйшым курсам мэд. асьветы. Праверка прыстасавана не да канца году, а правяцца на працягу ўсяго навучальнага году ў часе заняткаў. Гэта дае магчымасьць выкладчыку безадкладна высьвятляць слабае месца і ўжываць своечасова ўсе меры для ліквідацыі прарываў. Застаецца яшчэ шмат работы па паляпшэньні мэтадаў выкладаньня, па выпрамленьні ідэалёгічнага зьместу выкладаньня, па прыстасаваньні праграм, па рабоце з асьпірантурай, па падрыхтоўцы кадраў для ін-ту і для навуковай працы. Гэтым пытаньням будуць адведзены паасобныя артыкулы.

Тут я спынюся на адным пытаньні, якое мае вялізарнейшае значэньне для нашага ін-ту, а іменна на пытаньні аб профілі доктара, які патрэбен НКАЗ, і аб тых мэтадах, якімі мэд. ін-т яго рыхтуе. Пытаньне гэта набывае ў сучасны момант яшчэ тым большае значэньне, што ў красавіку прадстаіць новы набор у мэдыцынскі інстытут, а савецкая грамадзкасьць мала інфармавана адносна тых эрухаў, якія адбыліся на гэтым фронце.

Да апошняга часу органы аховы здароўя, галоўным чынам, патрабавалі доктара-універсала для раённага вучастку, які адначасова можа лячыць і ўнутраныя і хірургічныя хваробы і аказваць акушэрскую дапамогу. Ён-жа і спэцыяліст па дзіцячых, па вочных і інш. хваробах. У сучасны момант з ростам калектывізацыі—а згодна з дырэктывамі партыі да канца пяцігодкі яна павінна быць у асноўным закончана—патрабаваньні вёскі да культурнага абслугоўваньня радыкальна зьмяняюцца. Усё ўзрастаючы аварот да доктара і ў больніцы ня толькі рабочых прамысловасьці, але і працоўных вёскі ставіць пытаньне ня толькі аб колькасных паказальніках мэдычнай дапамогі, але і аб радыкальным эруху ў якасьці абслугоўваньня. Савецкая мэдыцына ня можа абмежавацца лячэньнем хворых, рамонтам. Яе галоўная мэта захоўваць і павялічваць чалавечую энэргетыку і працаздольнасьць работнікаў гораду і вёскі. Вось задача мэдыцыны ў сацыялістычным будаўніцтве. З гэтага вынікае, што мэдыцынскі інстытут у сваіх лябараторыях і клініках павінен на першы плян высоўваць прафілактычныя элементы мэдыцыны, якія вынучаюць і тэарытычна і практычна тыя ўмовы і мерапрыемствы, якія ўзмацняюць чалавечую энэргетыку ў працоўным працэсе.

Але некаторыя мэдыцынскія спэцыяльнасьці адыгрываюць асаблівую прафілактычную ролю. Маладыя гады найбольш небясьпечны ў сэнсе сьмяротнасьці і захворваньня. Залажыць у рабочай моладзі моцны фундамант фізычнага і псыхічнага здароўя—гэта значыць забясьпечыць саміудаўніцтва найбольш каштоўным элемэнтам Таму савецкая сыстэма аховы здароўя асобна выдзеліла дзьве галіны практычнай і тэарытычнай мэдыцыны: аховы матэры і дзіцяці і аховы здароўя падростку. Да апошняга часу ў гэтай галіне спэцыялізаваліся пасьля сканчэньня мэдфаку на працягу паўгода або году. Згодна дырэктывам партыі падрыхтоўка больш паглыбленага спэцыяліста зараз адбываецца ў сьцепах ВНУ або ВТНУ. Агульная база фізыка-хэмічных біялёгічных і агульна-мэдыцынскіх ведаў даецца ўсім студэнтам-мэдыкам. Але, у залежнасьці ад яго далейшай спэцыяльнасьці, больш глыбока вывучаюцца тыя артыкулы, якія датычаць яго далейшай працы. Са спэцыяльных прадметаў высоўваюцца тыя, якія дапамагаюць аўладаць тэорыяй і практыкай іменна акрэсьленай спэцыяльнасьці. Гэтаму адпавядае ў мэд. інстытуце аддзяленьне для падрыхтоўкі спэцыялістаў па аховe мацеры і дзіцяці і аздраўлэетру.

Ня менш важная прафілактычная галіной савецкай мэдыцыны зьяўляецца ахова здароўя поласьці роту (стаматалёгія). Значная колькасьць захворваньняў, якія скарачаюць жыцьцё і зьмяншаюць працаздольнасьць, залежыць ад захворваньняў поласьці роту, зубоў, зеву, мідаліц. Хранічныя хваробы серца, сасудаў, нэрваў, раўматусныя захворваньні маюць часта сваёй крыніцай поласьць роту. Да апошняга часу ротавая мэдыцына была ў руках дантыстаў і зубных дактароў, рэдка хірургаў і тэрапэўтаў. Але-ж стары падыход, які грунтаваўся на індывідуальнай дапамозе, ня можа ахапіць усіх хворых. Адзіны шлях для аздараўленьня насельніцтва ў стаматалёгічных адносінах — прафілактыка, санацыя поласьці роту ў цалых групах рабочых прамысловасьці і калгасаў, у падросткаў. Стаматалёг атрымлівае паглыбленую спэцыялізаваную таксама ў мэд. інстытуце, а не ў сурагатных зуба-ўрачэбных школах. Стаматалёгічнае аддзяленьне мэд. інстытуту будзе выпускаць падрыхтаваных для практычнай працы дактароў, у якіх рабочае насельніцтва адчувае асаблівую патрэбу. Што датычыць спэцыялістаў па тэрапіі і хірургіі, дык у праграме мэдінстытуту прадугледжаны ўхілы, якія дадуць мажлівасьць яшчэ на студэнцкай лаўцы і ў часе вытворчага практыкуму набыць неабходныя тэарытычныя і практычныя веды, а кія дапамогуць мала дому доктару непасрэдна пасьля сканчэньня быць скарыстаным на спэцыяльнай пасадзе, або ў больніцы, або нават і ў адзіным дыспансэры.

Такім чынам, у мэд. інстытуце арганізаваны поўны лекава-прафілактычны факультэт з аддзяленьнямі: аховы матэры і дзіцяці і здраўдзету, стаматалёгіі, тэрапіі і хірургіі. Спэцыялізацыя пачынаецца, галоўным чынам, з 3-га году навучаньня.

Нават яшчэ большае значэньне набывае ў нашых умовах другі факультэт мэд. інстытуту—санітарна-гігіенічны. Барацьба за здаровага, фізычна і псыхічна моцнага і працаздольнага чалавека павінна накіроўвацца ня толькі у бок асобнага рабочага, або груп працоўнага насельніцтва. Яшчэ ў большай ступені мэдыцына павінна ахапіць трунтоўнымі гігіенічна-санітарнымі мерапрыемствамі ўсе бакі ўсёй працы і ўсяго жыцьця работнікаў гораду і вёскі. Корань савецкай мэдыцыны—у непасрэднай барацьбе са шкоднымі ўплывамі на здароўе і на працаздольнасьць з боку усіх зьвешніх фактараў, як прыроды: вады, паветра, глебы,—так і быту: жыльля, харчаваньня і г. д. і працы: на прамысловасьці, або ў калгасах, або ў школах. Санітарныя дактары павінны быць знаёмымі і тэарытычна і практычна з гігіенай і санітарыяй прамысловасьці і добра разумець усе яе тонкасьці для насьпяховай барацьбы са шкоднасьцямі. Гігіена жыльлёвага і інш. будаўніцтва — вэнтыляцыя, анал, валазабесьпячэньне, будаўнічыя матар'ялы, гігіена харчаваньня, гігіена школьная, камунальная, эпідэміялёгія, спэцыяльная барацьба з узбудзіцелямі інфэкцыйных захворваньняў—вось тое кола праблем, якія стаяць перад санітарным дактарам. Санітарныя дактары — галоўны штаб, уплыў якога на сацыялістычнае будаўніцтва павінен усё больш узмацняцца. Трэба адзначыць, што ня можа быць ні адной галіны сацыялістычнага будаўніцтва, у якой санітарны доктар не павінен прымаць самага актыўнага ўдзелу. Асабліва для санітарна-гігіенічнага факультэту неабходна, каб у яго ўліліся рабочыя з вытворчасьці, будаўнікі, харчавікі, нарпітаўцы. Сярод іх трэба асабліва разгарнуць агітацыю за мэд. інстытут, які да 1-га красавіка адкрые новы прыём студэнтаў і які зараз прымае студэнтаў на свой рабочы факультэт. На санітарна-гігіенічным факультэце спачатку будуць рыхтавацца санітарныя дактары па ўсіх пералічаных галінах гігіены. Але-ж няма ніякага сумненьня, што жыцьцё ў бліжэйшы час і тут паставіць пытаньне аб яшчэ больш паглыбленай спэцыялізацыі на гігіену прамысловасьці, гігіену камунальную, жыльлёвую, школьную, харчаваньня, эпідэміялёгію.

*) Гл. «Зьвязду» № 287 ад 9-XII 1930 г.

На стара-дароск'м раённым зьезьдзе саветаў

Выправіць „лявацкі" загіб

СТАРЫЯ ДАРОГІ, 2. (Наш кар., па тэлефону). Старшыня СНК ВСВК т. ГАЛАДЗЕД прыехаў у Старыя Дарогі на раённы зьезд саветаў. Тав. ГАЛАДЗЕД зрабіў даклад аб рабоце ўраду. У сваім дакладзе тав. Галадзед спыніўся на вузлавых пытаньнях работы ў вёсцы і паставах студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, аб павялічэньні тэмпаў калектывізацыі. Даклад быў заслухан зьездам з вялікай увагай.

На зьезьдзе прысутнічае 77 дэлегатаў, з іх 23 калгасьнікі, 14 жанчын. Але на зьезьдзе зусім не прадстаўлены адна-асобнікі, што ва ўмовах раёну, са слаба разьвітым калгасным рухам, зьяўляецца палітычнай памылкай, ярнім праяўленьнем «левага» загібу.

Па дакладзе аб рабоце ўраду і РВК разгарнуліся гарачыя спрэчкі, у якіх былі закрануты ўсе галіны жыцьця раёну.

Са спрэчак выяўлена, што калектывізацыя ідзе вельмі марудна. На сёньнішні дзень у калгасах налічваецца 10 проц. усіх гаспадарак. Плян збожжазагатовак выкананы на 70 проц., загатоўкі ільнавалакна — на 11 проц., канапель — на 2 проц., вывазка песу на дрывах выкананa на 40 проц., па будаўнічых матар'ялах — на 16 проц.

Нельга не адзначыць, што некаторыя сельсоветы [illegible] організатарамі калгаснага руху. Правая практыка [illegible] таў: патураньне кулаку, бязьзьмі яго чапаць і ў той самы час АДМІНІСТРАВАНЬНЕ У АДНОСІНАХ СЕРАДНЯКА. Усё гэта, бязумоўна, ня спрыяе калгаснаму прыпіву.

У раёне будуецца МТС, але яна не распачала ніводнай дагаворнай кампаніі.

Зьезд праходзіць пад знакам жорсткай самакрытыкі. Дэлегаты зьезду бяруць цьвёрдыя абавязацельствы дабіцца на мясцох неадкладнага пералому ў рабоце і перанімчыцца на ўдарныя тэмпы ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы; разгарнуць шырокую масавую работу па павышэньні калгаснага прыпіву.

Сёньня т. Галадзед выехаў у калгасы і бліжэйшыя вёскі, дзе ён правядзе рад сходаў.

МЕНСК

Вінаватыя ў ствараньні чаргі за хлебам прыцягваюцца да адказнасьці

ЗА АПОШНІЯ ДНІ Ў ХЛЕБНЫХ КРАМАХ МЦРК НАГЛЯДАЛАСЯ ВЯЛІКАЯ ЧАРГА, ЯКАЯ ЗЬЯВІЛАСЯ ВЫНІКАМ НЕРАСПАРАДЧАСЬЦІ ПААСОБНЫХ РАБОТНІКАЎ МЦРК, КІРУЮЧЫХ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕМ ХЛЕБА.

КАЛЕГІЯ НК-РСІ БССР ПРАПАНАВАЛА ПРАКУРОРУ РЭСПУБЛІКІ Ў ТЭРМІНОВЫМ ПАРАДКУ РАСЬСЬЛЕДВАЦЬ ГЭТУ СПРАВУ І ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ВІНАВАТЫХ У СТВАРЭНЬНІ ЧАРГІ ЗА ХЛЕБАМ. СЬЛЕДЗТВА НАВІНА БЫЦЬ СКОНЧАНА НА ПРАЦЯГУ 10 ДЗЕН.

Усебеларускі зьезд вэтэрынарных дактароў

Калегія Наркамзему БССР пастанавіла склікаць у Віцебску на 15-е сакавіка першы Ўсебеларускі навуковы зьезд вэтэрынарных дактароў.

Вызначан наступны парадак дня зьезду: даклады т. т. Масюкова і Аўчыньнікава аб рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўлі, даклад тав. Грузакова аб стане вэтэрынарнай справы і задачах у гэтай галіне, даклад вэтэрынарнага навукова-дасьледчага інстытуту аб вывучэньні эпізоотыі сярод жывёлы ў БССР і інш.

У працы зьезду прымуць удзел усе раённыя вэтэрынарныя дактары і 50 дактароў гаспадарчых аб'яднаньняў і калгасна-каапэрацыйных сыстэм.

Трактарная калёна імя МОПР'у

Да веснавой пасеўнай кампаніі арганізуецца трактарная калёна імя ЦК МОПР'у Беларусі, Менскай, Гомельскай, Віцебскай і Мазырскай арганізацыям МОПР'у даручана стварыць трыерныя брыгады ў дапамогу калгасам і бядняцкім гаспадаркам.

Адначасова з гэтым будзе разгорнута масавая растлумачальная работа аб задачах МОПР'у ў справе калектывізацыі. Усім РК МОПР'у прапанавана стварыць брыгады з МОПР'аўскага актыву для дапамогі калгасам і саўгасам у правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі. Будзе выпушчана спэцыяльная аднадзенная газэта «МОПР».

152 студэнты—на пасеўную кампанію

Наркамзем БССР пастанавіў мабілізаваць на пасеўную кампанію 152 студэнты другога курсу Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі і зоаінстытуту.

Студэнты прабудуць у раёнах з 1-га сакавіка да 15-га мая.

ЗА ДЗЕНЬ

— Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам Галубка арганізуе экскурсійную паездку тэатру ў Маскву.

— Калегія Наркамасьветы пастанавіла запрасіць на гастролі ў Менск украінскі дзяржаўны яўрэйскі тэатр.

Начальніку галоўнагастацтва тав. Гурскаму даручана дагаварыцца аб тэрміне прыезду тэатру ў Менск.

У 1931 г. пры падфаку БДУ адкрываецца польскае аддзяленьне. На аддзяленьне будзе прынята звыш 15 чал.

Праектуецца таксама адкрыць польскія аддзяленьні пры трох педагагічных інстытутах, якія будуць рыхтаваць настаўнікаў для польскіх сямігодак.

Паездка б. правадыроў грамады ў рёны БССР

Учора былыя паслы Беларускай рабоча-сялянскай грамады т. т. Мятла, Ранміхайлоўскі, а таксама т. Бурсэвіч выехалі ў Воршу, на Асінбуд, у Магілеў і Віцебск.

Мэта паездкі — папулярызацыя кампаніі веснавой дапамогі палітзьняволеным капіталістычных турмаў і азнаямленьне з буйнейшымі прадпрыемствамі гэтых раёнаў.

13.500 руб. у фонд зімовай дапамогі палітзьняволеным

За апошнія 15 дзён студэнты ў фонд зімовай дапамогі палітзьняволеным капіталістычных турмаў паступіла 13.500 р.

Сваячасова падрыхтавацца да будаўніцтва 1931 г.

Да 15 лютага падаць праект

Прэзыдыум ВСНГ заслухаў даклад аб падрыхтоўцы да будаўніцтва 1931 г. Прэзыдыум адзначыў, што хэмаб'яднаньне, мэталаб'яднаньне, тэкстыльаб'яднаньне, паліграфаб'яднаньне, ільнаб'яднаньне, запалкавае аб'яднаньне, скураб'яднаньне і Лесбел — да [illegible] часу не падалі праектаў будаўніцтва.

Будаб'яднаньне не зрабіла залвае на рабочую сілу, патрэбную для ўсяго будаўніцтва.

Да гэтага часу не адгружаны поўнасьцю будаўнічыя матар'ялы, вызначаныя на першы квартал бягучага году. Гэта зьяўляецца сур'ёзным тормазам у падрыхтоўцы да будаўніцтва.

Прэзыдыум ВСНГ абавязаў аб'яднаньні падаць да 15 лютага праекты ўсіх аб'ектаў будаўніцтва. Будаб'яднаньню разам з сэктарам забесьпячэньня ВСНГВ даручана ў трохдзённым тэрміне дагаварыцца аб прадастаўленьні патрэбнай колькасьці вагонаў для перавозкі будаўнічых матар'ялаў.

З лістоў рабселькораў

РАЙСАВЕТ АСОАВІЯХІМУ БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЕ

Любаньскі райсавет Асоавіяхіму літаральна нічога ня робіць. Валянізацыя ў заняпадзе, членскія ўзносы не спагнаюцца па працягу доўгага часу. Дырэктывы Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму ня выконваюцца. Па раёне недаразьвіта лётарэйных білетаў Асоавіяхіму на 500 руб.

Кіруючыя органы раёну ведаюць аб бязьдзейнасьці райсавету, але ня прымаюць ніякіх мер.

ШМАТАЎ.

ГАНДЛЯРСКІЯ «ТАЛЕНТЫ» РАЙКАПСАЮЗУ

Смалявіцкі райкаапсаюз самавольна навышае цэны на тавары.

Каапсаюз купляе торф у арцелях па 12 руб. за куб, а прадае—па 17 руб. (накідка звыш 30 проц). Куб. мэтр дроў каштуе ў райкаапсаюзе на 3 руб. 60 кап. даражэй, чым на складзе спажывецкай каапэрацыі.

«Камэрцыя» райкаапсаюзу абходзіцца спажыўцом і ўстановам вельмі дорага. Так, райкамбінат на адным торфе пераплаціў райкаапсаюзу звыш 3 тысяч руб.

***

У раённым спажывецкім таварыстве дэфіцытныя тавары разьмяркоўваюцца амаль выключна па пратэкцыях. Некаторыя тавары нават не даходзяць да крам, а рэалізуюцца проста з базы. Вельмі дрэнна наладжана грамадзкае харчаваньне. Сталоўка — у антысанітарным становішчы.

КАРТУСОЎ І СВОЙ.

— **Гарсавет Асоавіяхіму.** 6-га лютага г. г. у 8 гадз. вечара, у памяшканьні Дзяржтэатру адбудзецца вечар, прысьвечаны 50-гідзьдзю т. Кліма Варашылава, арганізуемы гарсаветам Асоавіяхіму, сумесна з гаркомам ЛКСМБ.

Білеты для яч. Асоавіяхіму выдаюцца ў гарсавеце Асоавіяхіму, а для яч. КСМ —у гаркоме камсамолу.

Паведамленьні

Пастанова ЦК КП(б)Б аб мабілізацыі для насылкі ў раёны на веснавую пасеўную кампанію.

1. Мабілізаваць для насылкі ў раёны з 5-га лютага 1931 г. у мэтах узмацненьня ходу загатовак і разгортваньня падрыхтоўкі да веснавой сяўбы наступных т. т.: Шаранговіч, Гантман, Чарнушэвіч і Кавалёў (ЦК КП(б)Б), Хапневіч (ЦВК), Жуковіч (ЦСПСВ), Платуп (НКАСьветы), Сянкевіч, Абрамсон, Мірынтоф, Гітлін і Боер (НКГандлю), Гольштэйн (Дзяржпляны), Васкабойнікаў (ВСНГ), Міхайлаў (НКЮ), Захарава (НКПрацы.) Філатаў (Дзяржбан), Цёмкін (Саюзэкуп), Цэпцыпэр (НКАЗ), Гуревіч (ЦКК-РСІ), Кроль (НКЮ), Рывінскі (ЦКК-РСІ), Палякоў і Гайдукевіч (ЦК ЛКСМБ), Ганін (НДІ імя Леніна), Ластоўскі, Кісельер (Белмяса), Журомскі (БМЖС), Лукевіч (Белснаб), Пятровіч (Белсельснаб), Сьцепановіч (БІК), Бэненбом (Саюзхлеб), Шчалько (Дзяржстрах), Мелянкевіч (СНК, кам. друку), Кандраль, Рубін (БКС), Бучукас (БДВ), Будзін (БДВ); Гайдук (ЦК КСУ), Брыськін (Сампрамселов), Марозаў (упаўн. Пушнасьнд.), Штэйнэр (кір. скураб'яд.), Ошараў і Гольдбрах (НКА), Галаскоп (Камунбанк), Нісьневіч (кір. трэсту), Яфімаў (Апчадкасса), Сяліванаў (Белрыба), Раксін (кір. Белсельпрамаб.), Якубчык (нач. сл. міліц.), Стрыго (Сьвінавод), Серафімаў (БАН), Чарнушэвіч (Хлебінспэкцыя), Зарабоўскі (ЦП працасьветы), Рэман (ЦП Наперработы) Краўчук (ЦП саюзу шэйв.), Тамашэвіч (ЦП с. гарнак.), Штэйман (ЦП с. гарбароў), Жалезьнякоў (ЦП с. сувязі), Агранат (ЦП тран. раб.), Юдзін (ЦП Камунальнікаў), Альтман (ЦП харчав.), Савасьнюк (пракур. НКЮ), Шпхасін (Маслатрэст).

2. Даручыць НКЗему і Калгасцэнтру мабілізаваць свае апараты для апаратыйнага кіраўніцтва і праверкі падрыхтоўчай работы да веснавой сяўбы.

— **Сьпіс дакладчыкаў, выпучаных Менгарномам КП(б)Б для правядзеньня дакладу аб пастановах студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б:** Гантман — чыгунка, Агульнік — «Полымя Рэвалюцыі», Галадзед — «Энэргія», Кавальчук—«Бальшавік, Ракаў — «Ударнік», Пятушкоў—Абутк. ф-ка, Рудзінкі — Шчотачная, Каланда — Шчапінная, Шпектараў — «Камунар», Фрыдман — «Дравазапрад.», Жуковіч — Шклозавод, Лынько—«Беларусь», Каменеў — «Камунарка», Дупец — «Кастрычнік», Цэпцыпэр — «Беларуская», Мікалаеў — Скарняж., Чэпко —Шпалерн., Саевіч—«Чырвоны Тэкст.», Капаплін — Хлебазавод, Майзель Ю. — Эльвод, Путнін — Упіль, Глускона — Хэмфармзавод, Канакоцін — «Пралетары» (Срож. зав.), Лодысеў — «Чырв. ХэміК», Крываносаў — ф-ка «Крупскай», Шаліма — УМТ, Бібенбоем — грузчыкі, Брыскін — лямпавая ф-ка, Лойка — палата мер і вагі, Міхайлаў—БСПС, Рыўкін — ЦПП, Ошараў — ф-ка «8-га сакавіка», Гольдэрг — друкарня «Імя Сталіна», Хаскін — Мебуд, Балашэўскі — ф-ка Рымароў, Лабадаеў, —Пажарн. к-да, Яцкевіч — Аўтакіраўніцтва, Раскін — Каап. прад. харч., Кумкес — сталовыя МЦРК, Тарасевіч—«Чырв. Зорка», Масевіч—Малочны зав., Кофман — Хладбойня, Конікаў—Абутк. майст., Янаўлеў — Сьвіртавод, Гутман —Каўбасная ф-ка.

Рэзервовымі дакладчыкамі вылучаюцца наступныя т. т.: Галаскоп, Ліонардо, Аргоў, Калоўч, Палякоў, Рэмізевіч, Панкевіч, Бялуга, Красіна, Кучынскі, Шастакоў, Прынц, Вержбаловіч, Некрашэвіч, Конюхаў, Алесін, Тамашэвіч, Кондраль, Шчарбакоў, Селіванаў, Кірнас, Розенгауз. Усім сакратарам яч. дагаварыцца з дакладчыкамі аб часе і месцы дакладаў.

Усім вылучаным т. т неабходна зьявіцца ў Дом Камасьветы на кансультацыю 4/II у 7 гадз. (пакой №19).

— **Культпроп ЦК КП(б)Б 4 лютага ў 12 гадз. дня склікае пасяджэньне францыі праўленьня асацыяцыі марксыстаў навуковых таварыстваў.** Выклікаюцца т. т. Сербэнта, Сянкевіч, Панкевіч, Капаплін, Ганін, Сякерская, Горын, Мальпэр, Зуськоў, Лур'е. Зьявіцца сваячасова.

— **Дом Пісьменьніка.** Сёньня, 3-га лютага, у 7 гадз. в. адбудзецца сход на пытаньні: «Творчая дыскусія». Уступны даклад т. Гальперыная. Запрашаюцца пісьменьнікі, студыйцы, літгуртковцы, студэнты, настаўнікі літаратуры, бібліятэкары. Прысутнасьць членаў БелАПП'у абавязкова.

— **Партпрэйка Мен. гар. КК КП(б)Б** выклікае на пасяджэньне П. Т. 5-га лютага 1931 г. у 6 гадз. веч. (Энгельса, 28, 2-гі паверх) наступных таварышоў: Арлоўскі С. П. (з-д «Камунар»), Немалякін (бел. аддз. «ОГИЗ' РСФСР»), Ляніцкі А. І. (Камвуз), Гольдзін, Шустэрман, Ляховіч, Харленка (Наркамгандлю), Хмяліцкі, Лапцоў, Іваньковіч, Маноў (Нарсувязь), Дзячкоўскі (гарсавет), Эйдэльбэрг («Чырвоны тэкстыльшчык»), Мандукевіч Ю. К. (МВБ чыг.), Радкевіч з-д «Бальшавік», Гельмановіч (абутковая майстэрня), Пякурын, Іраэліт, Калмановіч, Чарнецкі, Грабузоў і Паходня (Лесбел), Навумчык (футравая ф-ка), Перавезьнікаў (Белдзяржбуд), Левін («Полымя рэвалюцыі»), Плеско (Камвуз), Матлок (ф-ка «Кастрычнік»), Багдановіч (Зямляроб)—для ўдзелу ў разглядзе іх спраў. Таксама выклікаюцца сакратары ячэек КП(б)Б, дзе гэтыя таварышы знаходзяцца на вучобе. Яўка абавязкова.

— **Дом Камуністычнай асьветы імя Карла Маркса,** 3/II у 7 гадз. веч. — група навая кансультацыя для завочнікаў Камвузу, СПШ і таварышоў, якія займаюцца самаадукацыяй па эканомгеаграфіі і матэматыцы. Ад 6 да 10 гадз. — індывідуальная кансультацыя па партбудаўніцтве.

— **Т-ва эканамістаў-марксыстаў.** Сёньня ў 8 гадз. вечара, у памяшканьні Дзяржпляну (Плац Волі № 5, габінэт старшыні) адбудзецца пасяджэньне праўленьня т-ва эканамістаў - марксыстаў, сумесна з працаўнікамі Інстытуту эканамічных дасьледаў. Запрашаюцца т.т.: Лур'е, Гальдштэйн, Ноткін, Расін, Аксэльрод, Окур, Тамапэвіч, Аксэнбэрг, Голанд, Чудноўскі, Капцельсон, Лойка і Слонім. З прычыны важнасьці і тэрміновасьці пытаньняў, яўка абавязкова.

— **НК РСІ і ЦСПСБ** склікаюць 4-га лютага ў 6½ гадз. вечара ў памяшканьні НК РСІ (Савецкая, 55, другі паверх) нараду па пытаньні аб асноўных чарговых задачах на паляпшэньні працы апарату (выніку ўсесаюзнай нарады па паляпшэньні апарату). Выклікаюцца рацыяналізатары ўсіх цэнтральных і гарадзкіх устаноў, работнікі па кантролі выкананьня, члены «ОРУ», члены эканомсэктараў і мясцовымі, брыгады рабочых, якія шэфствуюць над апаратам, прадстаўнікі адміністрацыі, прадстаўнікі ад рэдкалегіі насьценгазэт, прадстаўнікі рэдакцый газэт. Запрашаюцца таксама прадстаўнікі парт'ячэек прадпрыемстваў і ўстаноў і ўсе жадаючыя рабочыя і служачыя.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-90	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная контора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі (з дарожным дадаткам „Пра друк")

На 1 мес.	— 1 р.
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок мал. пасьля тэксту — 50 к., і ня гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Тэкст з тэксту—у два разы дарожэй. Кантрагентны рахунак выдавецтва № 52100501 у Дзяржбанку

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДЫ" Менск, Савецкая 63, 2-ы паверх тэл. 7-31.

Сёньня 3-II, у 7 гадз. увеч. у памяшканьні ЦК склікаецца нарада мабілізаваных ЦК КП(б)Б на правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі.

Яўка ўсіх памянён. у пастанове ЦК ад 26-I таварышоў абавязкова

Зам. агітмасавым аддзелам ЦК КП(б)Б БЕЛАШЭЎСКІ.

ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ імя КАРЛА МАРКСА.

4-га лютага 1931 г. у 7 гадз. вечара адбудзецца даклад тав. ШПЕКТАРАВА на тэму:

„ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ ПЕРАВЫБАРАЎ ГАРСАВЕТУ".

Білеты для парт'йных і камсамольск. актыву—у Гаркоме КП(б)Б і чытальні Дому.

Пасьля—мастацкая частка.

Агульна-гарадзкая нарада упаўнаважаных яч. КП(б)Б і партгалектываў па выпісцы газэт і часопісяй адбудзецца **4-га лютага ў 7 гадз. увеч.** у памяшканьні Гаркому.

Адказваць за яўку ўпаўнаважаных усклахаецца на сакратароў партячэек.

СЕРАДА, 4 лютага паказ для зав. „Бальшавік". Пач. так у 9 г.

Беларускі другі дзяржаўны тэатр В. Кіршон. **РЭЙКІ ГУДУЦЬ** Пьеса ў 5 дзеях. 9 абразох.

КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ГОРКА" Новы мастацкі фільм вытворчасьці „Саюзкіно" **АМЭРЫКАНКА** кіно-эпапэя ў 6 частках. Часопісь „Саюзкіно" № 75. Пачатак сэансу: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. Каса адкрыта з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура" ВЯЛІКАЕ КАНЦЭРТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ арт. маск. Мюзік-Холла. М. і. Дарская, Эмль Кемпэр. 2 Жэрэ з—зусім новы рэпэртуар новы фільм сезону **ІГДЗНБУ** Пач. сэансу у 7 г., 8 г. 40 м. 110 г. 20 м. Каса—з 5 гадз.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" З прычыны вялікага посьпеху, 2-гі тыдзень **РУБІКОН** драма ў 7 частках. Пачатак 1-га сэансу—6 гадз. Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Галактары" І. остацкі фільм паводле раману Шолом-Алейхэма **МАБУЛ** (Крывавы патоп) драма ў 9 частках. Штодзённа 4 сэансы. Пачатак 1 с. у 6 г. Каса адкрыта з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр" Новы дзіцячы фільм вытворчасьці ВУФКУ **ГАЗЭТЧЫКІ** кіно-фільм у 6 частках. Пачатак сэансу у 1 гадз. дня. Каса адчыняе з 12 гадз. дня.

КІНО „СПАРТАК" 2-гі ТЫДЗЕНЬ Баявік **Барацьба гігантаў** драма ў 10 частках. Пачатак сэансу: 1 с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—11 г. Каса—з 5 гадзін.

У сувязі з ліквідацыяй Астрашыцка-Гарадзецкага і Самахвалавіцкага раённых крэдытных таварыстваў з 1-га ЛЮТАГА 1931 году,

АБВЯШЧАЕЦЦА

да ведама ўсіх устаноў, арганізацый і сельскага насельніцтва, якія ўваходзяць у тэрыторыю гарадзкой чарты,

што поўнае абслугоўваньне кліентуры з 4-II—31 г. будзе вытварацца МЕНСКІМ ГАРАДЗКІМ АДДЗЯЛЕНЬНЕМ ДЗЯРЖБАНКУ

(рог Савецкай і Ленінскай, 1-шы паверх).

МЕН. АДДЗЯЛЕНЬНЕ ДЗЯРЖБАНКУ.

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ

з 15-II—31 году

адкрывае ў Менску фабзавуч сувязі,

які будзе мець тры аддзяленьні:

тэлефоннае, тэлеграфнае і радыё.

Для паступаючых патрабуюцца веды ў абсёме 6-ці клясаў сямігодкі: у першую чаргу прымаюцца рабочыя, дзеці рабочых, калгасьнікі, батракі і беднякі.

Стыпэндыя вучням устанаўляецца—21 руб. Узрост для паступаючых ад 15 да 21 году.

ЗАЯВЫ ПРЫМАЮЦЦА да 10-II г. г.

Пры заявах павінны быць прыкладзены дакументы: даведка аб узросьце, сацыяльным становішчы, адукацыі, месцы працы і аб становішчы здароўя.

Заявы накіроўваць: МЕНСК, Ленінская 36, сэктар кадраў Беларускага Кіраўніцтва Сувязі.

БЕЛКІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ.

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

КАМІСІЯ ЦКК РСІ **па чыстцы і праверцы Беларускай Акадэміі Навук** СКЛІКАЕ **4-га лютага ў 12 гадз. дня нараду старшых брыгадзіраў,** на як